

Яшчэ звініць водгалас выпускных вечароў, а для некаторых надыходзіць час думаць пра новы навучальны год. Хтосьці пачынае прыглядацца да школьных прыладаў ужо цяпер...

СТАР 3



Два дні народзінаў, дзве маці... Гісторыю пра тое, як простая жанчына са Жлобіна выратавала яго ад смерці, распавёў малалетні вязень гета Барыс Макоўскі.

СТАР 4



Вельмі здзівіла публіку Луселія Ралдан. Незвычайна было пачуць песню «Васільковае неба» ад гэтай смуглявай пышнай кубінкі. Аказваецца, віцебскай публіцы падабаецца, калі спяваюць на беларускай мове.

СТАР 6

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

17 ЛІПЕНЯ 2012 г. АЎТОРАК № 135 (27250) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «ПАРЛАМЕНЦКІЯ ВЫБАРЫ Ў БЕЛАРУСІ ПРОЙДУЦЬ АДКРЫТА, ТРАНСПАРЭНТНА, ДАСТОЙНА»

**Беларусь не бачыць сябе па-за інтэграцыйнымі працэсамі. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 16 ліпеня на сустрэчы са старшынёй Выканаўчага камітэта — выканаўчым сакратаром СНД Сяргеем Лебедзевым.**

«Мы сябе не бачым па-за інтэграцыйнымі працэсамі, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Наша эканоміка не можа існаваць у закрытым рэжыме, і нават расійская. Ды і ўвесь свет развіваецца ў гэтым напрамку. Таму мы будзем адпаведным чынам выбудоўваць сваю палітыку».

Сяргей Лебедзеў падкрэсліў, што Беларусь заўсёды адыгрывала і адыгрывае актыўную ролю ў інтэграцыйных працэсах у СНД.

Ён расказаў, што Выканкам СНД накіраваў пісьмы ў дзяржавы — удзельніцы Садружнасці з прапановай у парадку ратацыі перадаць старшынства ў СНД у наступным годзе Беларусі. «Мы цяпер чакаем адказу, але папярэдняе зандзіраванне, папярэдняя рэакцыя дзяржаў станоўчая», — сказаў ён. «Мы разлічваем, што Беларусь з 1 студзеня 2013 года стане старшынёй у СНД», — дадаў Сяргей Лебедзеў.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ведае аб існуючых праблемах у Садружнасці Незалежных Дзяржаў, і падкрэсліў: «Нашу пазіцыю вы ведаеце. У гэтым кантэксце мы будзем дзейнічаць у плане старшынства. Мы лічым, што ніхто не павінен адыходзіць ад нагрузак у СНД, ні адна з дзяржаў». «Калі будуць праблемы ў старшынстве, вы заўсёды можаце разлічваць на Беларусь, паколькі тут знаходзіцца штаб-кватэра СНД, інтэграцыйны цэнтр. Мы нясём асноўную адказнасць за гэта», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Другі блок пытанняў, які абмяркоўваўся на сустрэчы, датычыўся маючых адбыцца парламенцкіх выбараў у Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што яны пройдуць адкрыта і транспарэнтна.

«Мы тут нічога не хаваем, вы гэта ведаеце. Выбары мы хочам правесці адкрыта, транспарэнтна, дастойна. А галоўнае, каб выбары былі легітымныя, а гэта залежыць ад таго, наколькі свабодным будзе волевыяўленне», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Мы правялі шэраг нарад, усе атрымалі ўказанні, органы, якія будуць праводзіць выбары, сфарміраваны, пачалося вылучэнне кандыдатаў», — адзначыў Прэзідэнт. «Мы гэта зробім вельмі дастойна», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы запрасіў місію СНД для назірання за парламенцкімі выбарамі ў Беларусі. «Мы заўсёды з задавальненнем запрашаем місію СНД і хочам, каб вы яе ўзначалілі, як звычайна, таму што давер да вас вельмі высокі ў Беларусі, прытым усіх інстытутаў улады», — сказаў Прэзідэнт, звяртаючыся да Сяргея Лебедзева.

Старшыня Выканкама СНД расказаў, што фарміраванне місіі СНД пачалося. Як мяркуецца, доўгатэрміновае назіранне за выбарамі будуць ажыццяўляць прыкладна 30 чалавек, а непасрэдна ў дні выбараў у краіне будуць знаходзіцца каля 300 наглядальнікаў ад СНД. Аддзяленні штабоў місіі Садружнасці плануецца адкрыць ва ўсіх абласцях Беларусі.

«Наш папярэдні вопыт назірання паказвае, што, як правіла, мы атрымліваем усямерную падтрымку ад усіх структур улады ў Беларусі, ад Цэнтрвыбаркама, і таму ёсць падставы меркаваць, што наша місія справіцца са сваімі абавязкамі», — сказаў Сяргей Лебедзеў. Ён адзначыў, што місія СНД плануе, як і раней, кантактаваць з наглядальнікамі ад АБСЕ, розных міжнародных заходніх арганізацый. «Такія кантакты вельмі карысныя. І практыка паказала, што ў час такіх кантактаў, абмену думкамі, мы выпрацоўваем больш аб'ектыўныя ацэнкі праходзячых выбарчых працэсаў у краінах Садружнасці», — адзначыў старшыня Выканкама СНД. «Думаю, тое ж самае будзе і ў Беларусі», — дадаў ён.

Сяргей Лебедзеў таксама праінфармаваў кіраўніка дзяржавы аб актуальных тэмах, якія цяпер даводзіцца вырашаць Выканкаму СНД. У прыватнасці, аб падрыхтоўцы да пасяджэння Эканамічнага савета СНД, пасяджэння Савета кіраўнікоў урадаў СНД, якое адбудзецца ў верасні ў Ялце, а таксама сустрэчы лідараў краін СНД, якая пройдзе ў лістападзе ў Ашхабадзе.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## ГЕНЕРАЛ-МАЁР ВІТАЛЬ КІРЭЕЎ НАЗНАЧАНЫ НАМЕСНІКАМ МІНІСТРА АБАРОНЫ БЕЛАРУСІ ПА ТЫЛЕ

**Генерал-маёр Віталь Кірэеў назначаны намеснікам міністра абароны па тыле — начальнікам тылу Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Адпаведны ўказ Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 16 ліпеня.**

Генерал-маёр Аляксандр Балігатаў вызвалены ад вышэйназванай пасады і звольнены з ваеннай службы ў запас з правам нашэння ваеннай формы адзення і знакаў адрознення.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## КУПАЛЬНЯ ДЛЯ «ЧЫРВОНАГА КАНЯ»



**Жыхар вёскі Агарэвічы Ганцавіцкага раёна механізатар Анатоль ЖЫТКЕВІЧ купае каня ў сажалцы пасля трэніроўкі ў вясковым конна-спартыўным манежы.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### ЛІЧБА ДНЯ

***У 7,9** раза колькасць вакансій у Мінску перавышае колькасць беспрацоўных. На 1 ліпеня гэтага года было звыш 20,1 тыс. свабодных працоўных месцаў, а беспрацоўных зарэгістравана на гэту дату менш як 2,6 тыс. чалавек. Прычым у Мінску адкрыта практычна кожная трэцяя вакансія з агульнарэспубліканскага банка свабодных працоўных месцаў. У сталіцы больш за ўсё вакансій у сферы будаўніцтва — прадпрыемствы гатовы прыняць на працу плітачнікаў, тынкоўшчыкаў, маляроў, мантажнікаў і г.д. Адчуваецца дэфіцыт працоўных рук у сферах гандлю і грамадскага харчавання, транспарту і сувязі.*

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 19° |
| Віцебск | + 19° |
| Гомель | + 19° |
| Гродна | + 18° |
| Магілёў | + 19° |
| Мінск | + 19° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.07.2012 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 8310,00 ▼ |
| Еўра | 10160,00 ▼ |
| Рас. руб. | 254,50 ▼ |
| Укр. грыўня | 1027,00 ▼ |

■ Глыбінка

## ЛЯСНЫ БІЗНЭС



### «Грыбныя» камп'ютары, «сунічныя» аўтамабілі, «бруснічныя» рамонт, «журавінная» адукацыя



**Нарыхтоўшчык у перасовачным пункце Віктар Накуеў лічыць год урадлівым на дары лесу і спадзяецца на добры заробак.**

### Сабе і людзям

**Аграгарадок Заполле, што ў Бялыніцкім раёне,** месціцца ўдалечыні ад асноўных аўтамабільных дарог. Навокал — лясы, багатыя на грыбы і ягады. Штолета мясцовыя жыхары пераўтвараюцца ў лясных людзей з добрым прыбыткам: усе тут маюць адну на ўсіх выгадную падпрацоўку — збіраць і прадаваць грыбы і ягады, на якія ва ўсе часіны ёсць вялікі попыт.

Гавораць, што нарыхтоўшчыкі б'юцца за кожны кілаграм запольскіх грыбоў і ягад. У кожнага аматара збірання дароў лесу (і, натуральна, атрымання грошай ад гэтага карыснага «хобі») ёсць багаты выбар. У аграгарадку і навакольных вёсках актыўна прымаюць тавар больш за дзясятак «кантор», у тым ліку і прыватных.

На доме на вясковай вуліцы — невялікая паперка з назвай таварыства з абмежаванай адказнасцю з Мінскай вобласці. Гаспадыня, **Любоў Ягораўна Ермалаева,** працуе нарыхтоўшчыцай дароў лесу ў камерсантаў другі год і вельмі задаволена:

— Я пайшла на пенсію, і тут аказалася дарэчы мая прафесія бухгалтара, — гаворыць жанчына. — Мая справа — улік і прыём, штодня тавар забіраюць. Я ўжо нарыхтавала сёлета 5 тон ягад і 3 тоны грыбоў. Сама зарабляю, і ў людзей ёсць такая магчымасць. Вось сёння адзін мужчына прывёз адразу 35 кілаграмаў грыбоў і адразу атрымаў 600 тысяч.

СТАР 3

## З ПОЛЯ — АДРАЗУ НА ПЕРАПРАЦОЎКУ

У Гомельскай вобласці пачалася масавая ўборка збожжавых і зернебабовых культур. На гэты момант убрана збожжа на першых 3% плошчаў. Пакуль у камітэце па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама называюць сярэдняй ураджайнасць каласавых 28,7 цэнтнера з гектара. Самая высокая — у Рэчыцкім раёне: 34,8 цэнтнера з гектара. Дарэчы, на жніве-2012 у вобласці задзейнічана больш за 1,5 тысячы камбайнаў, у тым ліку 76 новых КЗС-1218 (GS-12) «Палессе», якія паступілі напярэдадні. Тым часам гаспадаркі Гомельскай вобласці пачалі рэалізацыю збожжа для дзяржаўных патрэб. Першыя аўтамашыны з харчовым збожжам новага ўраджаю прыбылі на камбінаты хлебапрадуктаў з Рэчыцкага, Петрыкаўскага, Хойніцкага і Калінкавіцкага раёнаў. Усяго па дзяржзаказе плануецца прадаць не менш за 150 тысяч тон збожжа харчовых кандыцый.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ЦЁПЛА І ДАЖДЖЫ

З аўторка і да пятніцы часам па краіне будуць ісці дажджы, месцамі навальніцы, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава. Тэмпература паветра 17 ліпеня будзе вагацца ад 17 градусаў па поўначы да плюс 24 па поўдні краіны. У ноч на сераду 8—14, а ўдзень чакаецца не больш як 15—22 градусы. А вось у чацвер удзень будзе зноў 17—24 цяпла, а ў Брэсцкай вобласці месцамі да 26 градусаў. Тут трэба адзначыць, што ніякіх сінаптычных катаклізмаў у выглядзе моцных дажджоў сіноптыкі не прагназуюць.

Паводле папярэдніх прагнозаў, у пятніцу на тэрыторыю нашай краіны будзе рухацца чарговы атмасферны фронт з боку Заходняй Еўропы, які прынясе чарговую порцыю кароткачасовых дажджоў і месцамі навальніцы. Уначы чакаецца плюс 10—17, удзень 18—24, толькі ў Гомельскай вобласці да 25—27 градусаў. Не абяцаюць сонечнага надвор'я айчынныя спецыялісты і ў выхадныя.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЕГІПЦЯНЕ ЗАКІДАЛІ ХІЛАРЫ КЛІНТАН ПАМІДОРАМІ І ЧАРАВІКАМІ



Дзяржсакратара ЗША Хілары Клінтан падчас яе афіцыйнага візіту ў Егіпет чакаў не надта цёплы прыём. Пасля выступлення кіраўніка амерыканскага знешнепалітычнага ведамства ў Александрыі, дзе яна адкрыла консульства ЗША, закрытае яшчэ ў 1993 годзе з-за недахопу фінансавання, дзяржсакратара закідалі памідорамі. Інцыдэнт адбыўся ў нядзелю, калі Клінтан пакідала будынак консульства і ў суправаджэнні егіпецкіх чыноўнікаў рухалася да свайго аўтамабіля. Паліцыя спрабавала стрымаць раз'юшаны натоўп, аднак егіпцяне, нязгодныя з выбраннем прэзідэнтам Мухамеда Мурса з «Братоў ісламістаў» і ЗША, якія выказалі падтрымку новаму кіраўніку Егіпта, сваю незадаволенасць усё ж выказалі. У бок Клінтан паляцелі памідоры і чаравікі. Калі чыноўнікі ўжо схаваліся ў аўтамабілях, у адзін з іх паляцела бутэлька з вадой. Наўздагон жонцы экс-прэзідэнта ЗША несліся крыкі «Моніка! Моніка!», перадае CNN.

### ЖАНЧЫНЫ ВЫХОДЗЯЦЬ НА ПЕРШАЕ МЕСЦА ПА ЎЗРОЎНІ ІНТЭЛЕКТУ

Да нядаўняга часу мужчыны абыходзілі жанчын у тэстах на IQ. Але, па словах псіхолага Джэймса Фліна, жанчыны пачынаюць абганяць моцны пол, перадае InoPressa. У чым прычына, навуковец не ведае. Магчыма, цяпер для жанчын з'явілася больш магчымасцяў рэалізаваць сябе. Таксама не выключана, што ўсяму віной павышаная планка патрабаванняў і стрэс, выкліканы неабходнасцю спалучаць працу і сям'ю. На думку Фліна, чые словы прыводзіць газета La Repubblica, яшчэ ў 80-х стала зразумела, што на Захадзе паказчыкі IQ падрастаюць кожныя 10 гадоў на тры пункты. Гэта значыць наступнае пакаленне заўсёды будзе пераўзыходзіць папярэдняе, бо жыццё становіцца складаней, і ў адказ на гэта мозг адаптуецца, развіваючы інтэлект. Мяркуючы па ўсім, жанчыны больш абачліва рэагуюць на гэтыя змены. Сёння жыхаркі такіх краін, як Новая Зеландыя, Эстонія і Аргенціна, адназначна апярэджваюць мужчын, сцвярджае праведзенае Флінам даследаванне.

### ЭКСПЕРЫМЕНТ ПАКАЗАЎ: ЗВЫЧАЙНЫ ЧАЙ ПРАЦУЕ НЕ ГОРШ ЗА АНТЫБІЁТЫКІ

Штодзённае спажыванне гарбаты спрыяе зніжэнню рызыкі развіцця моцнай дыярэі і іншых захворванняў страўнікава-кішачнага тракта, даказала даследаванне Кардыфскага Універсітэта. Справа ў тым, што чай мае ў сабе злучэнні, здольныя забіць бактэрыю Clostridium difficile, піша The Times of India. У ходзе праведзенай працы даследчыкі праверылі эфект 33 гатункаў гарбаты на 79 штамах патагенаў. Аказалася, поліфенолы, якія даюць смак напою, забіваюць небяспечныя бактэрыі. Пакуль апублікаваныя вынікі аналізу толькі стандартнага чорнага чаю. Па словах прафесара Леса Байлі, сёння можна сказаць дакладна: зялёны чай усё ж такі спраўляецца з задачай лепш за чорны.



ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ПАРЛАМЕНТ ЛІТВЫ РАЗГЛЕДЗІЦЬ ПРАЕКТ РЭФЕРЭНДУМУ АБ БУДАЎНІЦТВЕ АЭС

У веснавую сесію парламент Літвы ўхваліў законы, якія адкрываюць дарогу будаўніцтву новай АЭС. Аднак па просьбе 55 дэпутатаў старшыня парламента Ірэна Дэгутэне склікала пазачарговую сесію. У праекце прапанаванай да абмеркавання пастановы прадугледжваецца правядзенне кансультацыйнага рэферэндуму аб новай АЭС адначасова з выбарамі ў парламент у другую нядзелю кастрычніка.

Літва плануе будаваць новую АЭС сумесна з Латвіяй і Эстоніяй у Вісагінасе, побач з Ігналінскай АЭС, спыненай у адпаведнасці з абавязацельствамі перад Еўрасаюзам 31 снежня 2009 года. Будаўніцтва Вісагінскай АЭС — першы рэгіянальны праект у галіне атамнай энергетыкі ў краінах Балтыі. З 17 мільярдаў літаў (каля 5 мільярдаў еўра) Літва на праект павінна выдаткаваць больш за трэць. Плануецца, што першы бетон у Вісагінасе зальюць да сярэдзіны 2016 года, а выпрацоўваць электраэнергію новая АЭС пачне ў 2020-2021 годзе.

КОРАТКА

Рэнтабельнасць продажаў арганізацый Беларусі за студзень—май гэта года вырасла ў параўнанні са студзенем—маем 2011-га на 3 працэнтныя пункты і склала 10,6 працэнта, паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце. За студзень 2012 года рэнтабельнасць продажаў склала 9,5 працэнта, у першым квартале — 10 працэнтаў, у студзені—красавіку — 10,3 працэнта.

XXX Алімпійскія гульні, якія пройдуць з 26 ліпеня па 12 жніўня ў Лондане, разам са шматмільённай сусветнай тэлеаўдыторыяй змогуць убачыць і беларускія тэлегледачы. Па традыцыі, у эфіры «Беларусь 1» перавага будзе аддавацца спаборніцтвам з удзелам беларускіх спартсменаў, а «Беларусь 2» на час Гульняў стане алімпійскім: штодзённа 18-19 гадзін эфірнага вяшчання тэлеканала будзе адведзена трансляцыям з Лондана.

Паводле аператыўных звестак, з пачатку года ў Беларусі ад пападання вады ў дыхальныя шляхі загінула 380 чалавек, у тым ліку 34 непаўналетнія, выратаваны 392 чалавекі. Беларускае рэспубліканскае таварыства ратавання на водах заклікае адпачывальнікаў абмежаваць сябе ў распіцці спіртных напіткаў каля вадаёмаў. Толькі за мінулы тыдзень у вадаёмах патанула 46 чалавек, з іх чацвёра — непаўналетнія. Больш як 80 працэнтаў тых, хто патануў, знаходзіліся ў нецвярозым стане. Выратавана матросамі АСВОДа з 9 па 15 ліпеня 66 чалавек, большая частка з якіх таксама была п'янай.

## ЯКІМ ЧЫНАМ ТРЭБА ЗАХОЎВАЦЬ ПАМЯЦЬ ПРА ВЯЛІКУЮ АЙЧЫННУЮ ВАЙНУ?



**Аляксандр МУКАВОЗЧЫК, генеральны дырэктар холдынга «СТ Група»:**

— Да захавання памяці трэба падыходзіць комплексна. Напрыклад, аднымі музеямі гэтага не зробіш, бо памяць павінна захоўвацца яшчэ і ў галовах людзей. Значыць, патрэбна адукацыя. А каб яна была — патрэбны музеі, куды можна прывесці моладзь. Таму ўсё трэба рабіць комплексна, тут няма нейкага адзіночнага рашэння. Тое, што музей вайны трэба новы стварыць — гэта адназначна. Тое, што дзецям у школе трэба прыгожа расказваць пра гісторыю краіны — гэта адназначна. Але не варта забывацца і пра іншыя сродкі, з дапамогай якіх можна захапіць гэтай тэмай моладзь: здымаць цікавае кіно, ствараць добрыя літаратурныя творы і г.д.



**Алег ЛЯЛІК, інжынер-праграміст ІП «Вэлком»:**

— Пакуль людзі будуць разумець важнасць гэтага этапу гісторыі — яны будуць пра яго памятаць. Да любой падзеі можна падыходзіць з двух пунктаў гледжання: з аднаго боку, што было — тое прайшло, і значыць — можна выкрасліць з памяці і жыць далей. А з другога боку, з кожнай падзеі можна атрымаць урок, запомніць яго і выкарыстоўваць у далейшым жыцці, быць яшчэ мацнейшым дзякуючы перажытаму і зробленым высновам. Так і з вайной: калі мы здолеем зрабіць урокі Вялікай Айчыннай вайны магутным механізмам росту і выхавання людзей, тады пра гэтую вайну ніколі не забудуцца. Ну а спосабаў, каб расказваць і нагадваць пра падзеі таго часу, вельмі шмат: здымаць мастацкія і дакументальныя фільмы, выдаваць кнігі, ствараць спецыялізаваныя сайты ў інтэрнэце, займацца прапагандай, ствараць і падтрымліваць дзейнасць грамадскіх арганізацый і гэтак далей.

**Падрыхтаваў Павел БЕРАСНЕЎ.**

# БЕЛАРУСЬ МАЕ НАМЕР І Ў ДАЛЕЙШЫМ ЭКСПАРТАВАЦЬ ПРАДУКЦЫЮ ВПК У СТРОГАЙ АДПАВЕДНАСЦІ З МІЖНАРОДНЫМ ПРАВАМ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 16 ліпеня прыняў з рабочым дакладам старшыню Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта Сяргея Гурулёва.**

«Хацеў бы перш за ўсё пачуць, як рэалізуюцца даручэнні, дадзеныя мною ваенна-прамысловаму комплексу пры вашым назначэнні. Шэраг пытанняў застаўся з мінулых гадоў, якія нам трэба будзе вырашаць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Галоўнае — не памыліцца. Нам не трэба хапацца за ўсе тэмы, — падкрэсліў Прэзідэнт. — І не трэба сёння вынаходзіць нейкі веласіпед, які наогул нам не патрэбны. Для нашай арміі патрэбна сучаснае ўзбраенне, а лішкі, калі такія створым, мы маем права і будзем іх прадаваць, не парушаючы міжнародныя дагаворы».

У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся сітуацыяй на прадпрыемствах ВПК, параметрамі іх знешнегандлёвага сальда.

Як далажыў Сяргей Гурулёў, абаронны комплекс дзяржавы развіваецца цалкам рытмічна. «У цэлым за перыяд існавання незалежнай рэспублікі мы ні разу не парушылі міжнароднае права. І ўсе спробы за вушы прыцягнуць тыя ці іншыя парушэнні пацярпелі няўдачу», — адзначыў ён.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# Місіі АБСЕ будзе прадастаўлена ў Беларусі ўся неабходная інфармацыя

**Місіі АБСЕ будзе прадастаўлены ў Беларусі ўвесь аб'ём неабходнай інфармацыі. Аб гэтым паведаміла ўчора журналістам старшыня Цэнтрвыбаркама Беларусі Лідзія Ярмошына, перадае БЕЛТА.**

Як расказала старшыня ЦВК, накіраванне такой місіі ў краіну, дзе будуць праходзіць выбары, — звычайная практыка. Перадавыя групы АБСЕ праводзяць сустрэчы са службовымі асобамі, палітычнымі сіламі апазіцыйнага напрамку. На аснове вывадаў такіх місій АБСЕ прымае рашэнне аб колькасці наглядальнікаў, якія будуць прысутнічаць на выбарах у той ці іншай краіне. «Мы прадаставім місіі ўвесь аб'ём неабходнай інфармацыі, а далей ужо справа АБСЕ вызначаць фармат свайго ўдзелу ў парламенцкіх выбарах у Беларусі», — сказала Лідзія Ярмошына.

Гаворачы аб выніках свайго ўдзелу ў дадатковай нарадзе АБСЕ, якая праходзіла 12-13 ліпеня ў Вене, Лідзія Ярмошына адзначыла, што паездка была плённая. «Упершыню за 8 гадоў я апынулася на трыбуне АБСЕ, якая ўсе гэтыя гады не турбавалася аб тым, чаму абмежаваны мае правы на свабоду перамяшчэння», — адзначыла старшыня ЦВК. Паводле слоў Лідзіі Ярмошынай, фармат нарады прадугледжваў удзел старшынь ЦВК толькі краін СНД. Кіраўнікі выбаркамаў іншых краін, як і прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці, не запрашаліся. «Задача нарады была ў тым, каб прадаставіць абодвум бакам магчымасць выслухаць адзін аднаго, зрабіць пэўныя вывады або пагразіць пальцам», — сказала на заканчэнне старшыня ЦВК.

# Сярод лаўрэатаў конкурсу «Человек Дела» — тры жанчыны

**Рэдакцыя часопіса «Дело» ў 17-ты раз падвяла вынікі свайго ўжо традыцыйнага конкурсу «Человек Дела», вызначыўшы пераможцаў у 12 намінацыях. Больш за палову пераможцаў — прадстаўнікі рэгіёнаў: Магілёўскай, Віцебскай, Гомельскай і Брэсцкай абласцей.**

— Сёлета нам органы ўлады і бізнэс-саюзы рэкамендавалі шмат кандыдатаў — каля 200 чалавек. Але моцнага кандыдата ў намінацыі «За лепшую бізнэс-ідэю», якую рэалізаваў беларускі прадпрымальнік, сёлета не было. Можа, таму, што час быў не падыходзячы для рэалізацыі новых ідэй. Але было вельмі шмат моцных кандыдатаў у намінацыі «За павышэнне прэстыжу маркі «Зроблена ў Беларусі». Таму сёлета ў гэтай намінацыі мы далі дзве ўзнагароды, раздзяліўшы іх на сферы — у лёгкай (дырэктару ААТ «Світанак» Іне Маліноўскай) і ў харчовай (дырэктару ААТ «Бярозаўскі сыраробны камбінат» Уладзіміру Папеню) прамысловасці, — расказаў **Віктар ЖУК, галоўны рэдактар часопіса**.

Цікава таксама, што лаўрэатамі конкурсу сталі і тры жанчыны — акрамя ўжо згаданай Іны Маліноўскай гэта дырэктар Магілёўскай фабрыкі марозіва Таццяна Бандарчук — за бездакорныя паводзіны ў няпростых рыначных умовах і дырэктар фабрыкі «Спартак» Алеся Самсонава — за актыўнае прыцягненне і эфектыўнае выкарыстанне інвестыцый. Што тычыцца астатніх пераможцаў, то імі сталі дырэктар МАЗа Аляксандр Бароўскі (за стабільную і эфектыўную працу на беларускім і замежным рынках), старшыня праўлення банка БелВЭБ Павел Калаур (за істотны ўнёсак у развіццё фінансавага рынку Рэспублікі Беларусь), генеральны дырэктар прадпрыемства «Бабруйскаграмаш» Сяргей Казачонак (за актыўнае садзейнічанне развіццю аграрнага сектара Беларусі), генеральны дырэктар страхавога таварыства «ТАСК» Ігар Волкаў (за высокую якасць бізнэс-паслуг), дырэктар прадпрыемства «Косвік» Уладзімір Яноўскі (за стварэнне прадпрыемства, якое дае прыклад пераходу на інавацыйны шлях развіцця), генеральнаму дырэктару ААТ «Ольса» Мікалаю Цыкунову (за паспяховае прымяненне новых тэхналогій і метадаў кіравання), генеральнаму дырэктару СТАА «Фартэкс — водныя тэхналогіі» Івану Пінчуку (за падтрыманне высокага стандарту замежнай маркі на айчынным рынку) і генеральнаму дырэктару ААТ «Нафтан» Уладзіміру Траццякову (за важкі ўнёсак у развіццё знешнеэканамічных сувязяў Беларусі).

Дарэчы, на цырымоніі ўзнагароджання былі чутны не толькі віншаванні і добрыя словы, але вяліся і сур'ёзныя размовы. У прыватнасці, Уладзімір Таццякоў расказаў журналістам пра тое, наколькі выгадна «Нафтану» гандляваць палівам на ўнутраным рынку:

— Ніколі не трэба сыходзіць з рынку, нават калі ён стратны. І калі знешні рынак дапамагае перакрываць унутраны рынак, то на ім трэба заставацца. Гэта наш брэнд, гэта наша якасць.

Зараз унутраны рынак вельмі прэміяльны, чэрвень і май — прэміяльныя вышэй за экспарт. Таму нельга казаць пра ўнутраны рынак, што ён заўсёды стратны. Бываюць розныя перыяды. Экспарт, напрыклад, сёння для нас менш выгадны, чым праца на ўнутраным рынку, — сказаў ён і дадаў, што ў апошні час доля продажаў на ўнутраным рынку павялічыліся з 30% светлых нафтапрадуктаў да 35%.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**


**Уважаемые акционеры ОАО «Світанак» г. Жодино**

**Наблюдательный совет сообщает о смене депозитария:**

Депозитарий: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, д. 32, ОАО «АСБ Беларусбанк», тел. 8(017) 218 84 12.

Депозитарный центр: 222120, г. Борисов, пр. Революции, д. 47, к. 203, ф-л 612 ОАО «АСБ Беларусбанк», тел. 8(0177)73 26 41.

Депозитарные агенты: филиалы ОАО «АСБ Беларусбанка» в городах Белоруссии.

Просьба акционеров обновить паспортные данные и адреса.

УНН 600038919


■ У свеце

# ЧАМУ АМЕРЫКАНЦЫ НЕ ДАВЯРАЮЦЬ СВАЙМУ ТЭЛЕБАЧАННЮ?



**У чэрвені 2012 года апытанне агенцтва Gallup у Злучаных Штатах аб узроўні даверу амерыканцаў да навін, якія атрымліваюцца пры дапамозе тэлебачання, пабіла папярэднія рэкорды і цяпер можа быць цалкам названа па-новаму — узровень недаверу амерыканцаў да тэленавін. Як паказала апытанне, толькі 21% тэлегледачоў заявіў, што цалкам давяраюць тэлебачанню.**

Такія вынікі апытання інакш як шакуючымі не назавеш. Але амерыканскія тэлегледачы маюць падставы для такога «галасавання аб недаверы» да свайго ўласнага тэлебачання.

Першай прычынай з'яўляецца сістэма парламенцкіх і прэзідэнцкіх выбараў у ЗША. Падчас праймерыз на прэзідэнцкіх выбарах і падчас канкурэнцыі дзвюх асноўных партый за месцы ў Кангрэсе і Сенаце навіны на амерыканскіх тэлеканалах трансфармуюцца ў патокі хлусні і ўзаемных абвінавачванняў дзвюх палітычных сіл у карупцыі, невуцкім кіраванні, неразуменні патрэб эканомікі і выбаршчыкаў. І амерыканскія тэлегледачы дакладна ведаюць, які канал трэба ўключыць, каб даведацца, што ва ўсіх бедах Амерыкі вінаваты рэспубліканцы, і вядучыя навін якога тэлеканала будуць з пенай каля рота крычаць, што ўсе праблемы ў амерыканскім жыцці звязаны выключна з дэмакратамі. Фактычна амерыканцам прапаноўваюць дзве праўды жыцця. Пры гэтым кожная праўда грунтуецца на банальнай прыналежнасці ўладальнікаў таго або іншага СМІ да Рэспубліканскай або Дэмакратычнай партыі ЗША. Але дзвюх праўдаў быць не можа, і два розныя пункты гледжання на свет, якія вылучаюцца на аснове партыйнай прыналежнасці СМІ, пачынаюць нагадваць шызафрэнію. А хто ж захоча, гледзячы рэгулярна тэлебачанне, адчуваць сябе шызафрэнікам, спрабуючы сумясціць у сваёй свядомасці несумяшчальныя пункты гледжання?

Наступнай прычынай з'яўляецца нарастальны недавер да знешняй палітыкі ЗША. Амерыканскім грамадзянам, якія цвяроза ацэньваюць нарастальныя праблемы ў эканоміцы, становіцца незразумела, чаму неабходна выдаткоўваць так шмат грошай не на вырашэнне цалкам відавочных праблем радавых амерыканцаў у іх уласнай краіне, а на арганізацыю ўварванняў, рэвалюцый і ўтрыманне ваенных баз па ўсім свеце. Таму пераможныя рэляцыі Пентагона аб чарговым поспеху «дэмакратызацыі» ў арабскім свеце або ў Афганістане амерыканскі тэлеглядач пачынае ацэньваць выключна з простага пункту гледжання: што мы забылі ў невядомай нам краіне і якую велізарную суму грошай ізноў патрацілі за мяжой, а не на сваіх грамадзян. Тым больш, што пераможныя рэляцыі потым аказваюцца на самой справе чарговай хлуснёй. «Перамога дэмакратыі» ў Егіпце або Тунісе заканчваецца ўсталяваннем альбо ісламісцкіх альбо ваенных аўтарытарных рэжымаў, з Афганістана рэгулярна прыходзяць усё новыя труны з целамі амерыканскіх вайскоўцаў і навідавоку боязь Пентагона, што навязаны афганцам палітычны рэжым тут жа абваліцца, калі вывесці кантынгент НАТА з Афганістана.

Цяжка амерыканцам ухваліць і стэрэатыпнасць навінавага рэпертуару тэлебачання. Амерыканцы з-за працэсаў іміграцыі і развіцця дыяспар на тэрыторыі ЗША становяцца ўсё больш рознымі, і дагадзіць іх густам становіцца ўсё складаней. Рэпартаж аб краінах ісламу і пагрозах сусветнага джыхаду, што станоўча ўспрымаецца белымі хрысціянамі, да якіх адносіцца і сам уладальнік студыі, можа быць зусім інакш успрыняты нядаўнімі выхадцамі з ісламскага свету. Яны нашмат лепш ведаюць сапраўдную сітуацыю ў гэтым рэгіёне, якая радыкальна адрозніваецца ад стэрэатыпных карцінак, што дэманструюцца па тэлебачанні. Ім, да таго ж, раніцай трэба будзе ісці на біржу працы, дзе патэнцыйныя працадаўцы могуць ад іх запатрабаваць доказаў, што яны ніяк не звязаны з ісламскімі тэрарыстамі і не збіраюцца нічога ўзрываць у ЗША. Або ўзяць асвятленне лацінаамерыканскіх навін. Белыя жыхары Амерыкі напружана глядзяць рэпартажы аб велізарнай карупцыі ў гэтым рэгіёне, войнах наркамафіі, якія скалынаюць цэлыя краіны. Іх палохае нізкі ўзровень медыцыны і высокая злачыннасць. Зусім з іншымі пачуццямі глядзяць гэтыя перадачы дзясяткі мільёнаў жыхароў ЗША, выхадцаў з Лацінскай Амерыкі, на якіх у выніку гэтых жахлівых рэпартажаў будуць глядзець заўтра на працы як на патэнцыйных прадстаўнікоў наркамафіі або будуць чакаць ад іх дзяжурных фраз, якія яны шчаслівыя, што змаглі перабрацца са сваёй краіны, якая раздзіраецца праблемамі на часткі, у «паспяховыя і дэмакратычныя ЗША». Са змяшанымі пачуццямі глядзяць перадачы аб Афрыцы і амаль сорак мільёнаў афраамерыканцаў, якія пражываюць у ЗША. Многім з іх незразумела, чаму іх вялізная і багатая краіна нават не спрабуе рэальна дапамагчы кантыненту, які пакутуе ад галечы і хвароб, у той час як знаходзіць магчымым выдзяляць штогод па 700 мільярдаў долараў на патрэбы Пентагона.

Дарэчы, праблемы, звязаныя з недаверам да тэленавін, з'яўляюцца агульнымі і ў дачыненні да газет. Тое ж апытанне Gallup прадэманстравала падзенне даверу да газет да 25%. Такім чынам, ЗША ўпэўнена ператвараецца ў нацыю, дзе ўласным СМІ не давярае тры чвэрці насельніцтва. Здаецца, амерыканскім уладам трэба задумацца: ці дабратворна гэта адаб'ецца на перспектывах Вашынгтона ў глабалізаваным свеце, дзе канкурэнцыя становіцца ўсё больш жорсткай?

**Сяргей КІЗІМА,**
**доктар палітычных навук,**
**загадчык кафедры міжнародных адносін**
**Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце**
**Рэспублікі Беларусь**

■ У краіне

# АПАЗІЦЫЯ ПЕРАД ТВАРАМ ГЛАБАЛЬНАГА КРЫЗІСУ



**15 ліпеня ў Беларусі распачаўся этап вылучэння кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Паводле айчыннага заканадаўства, права вылучаць сваіх прэтэндэнтаў на месцы ў парламенце маюць палітычныя партыі, працоўныя калектывы і грамадзяне шляхам збору подпісаў.**

Палітычныя партыі маюць права вылучыць сваіх кандыдатаў ва ўсе 110 выбарчых акруг — па адным у кожнай з іх. Працоўныя калектывы маюць права вылучаць не больш чым аднаго кандыдата на тэрыторыі знаходжання прадпрыемства. «Простыя» грамадзяне маюць права вылучаць кандыдатаў шляхам збору подпісаў (не менш за тысячу за аднаго кандыдата).

Як бачна, для партый парадак вылучэння кандыдатаў найбольш просты. Пры колькасці членаў не менш за 1000 чалавек партыя можа вылучыць 110 кандыдатаў. Больш за тое, кандыдаты палітычных партый — адзіная катэгорыя кандыдатаў, якія па ўсёй краіне могуць быць аб'яднаныя адзінай афіцыйнай ідэалогіяй, адзінай праграмай і быць прадстаўнікамі адной арганізацыі — палітычнай партыі.

Грамадзянскія аб'яднанні дэ факта таксама могуць вылучаць кандыдатаў з ліку сваіх членаў і актывістаў. Але юрыдычна для мэты выбарчай кампаніі гэтая іх сувязь з аб'яднаннем не можа быць зафіксавана і само аб'яднанне не можа кансалідавана выступаць у падтрымку свайго кандыдата.

Усё гэта азначае, што пераважнае значэнне для выніку выбарчай кампаніі будзе мець не партыйная барацьба, а сутыкненне індывідуальных кандыдатаў, падтрыманых тымі ці іншымі грамадзянскімі структурамі.

Вядома, такая сітуацыя рэзка зніжае палітычную вагу ідэалогій і палітычных платформаў, набліжае кандыдатаў да жыхароў канкрэтнай акругі, робіць больш важнымі адносіны кандыдата з мясцовымі супольнасцямі. Гэта і ёсць тое, што называецца мажарытарнай выбарчай сістэмай. І яна, трэба адзначыць, выглядае больш дэмакратычнай, чым барацьба партыйных спісаў, калі грамадзяне могуць выбіраць не тых, каго вылучаюць самі, а тых, каго вылучаюць партыі ў свае спісы.

Але ёсць у гэтым парадку і адваротны бок. Калі кандыдаты ідуць на выбары без праграмы, нельга прадугледзець, як яны будуць паводзіць сябе ў новых абставінах, калі знешнепалітычная ці эканамічная сітуацыя будзе хутка змяняцца. Напрыклад, для сацыялістаў, тэарэтычна, у любых абставінах важна абараніць правы працоўных. І гэта азначае, што нават у эканамічна небяспечнай сітуацыі яны будуць абараняць сацыяльную сферу.

Індывідуальныя кандыдаты такіх публічных абавязкаў не маюць. І гэта можа мець значны ўплыў на тое, як будзе развівацца палітычная сітуацыя ў Беларусі ў бліжэйшай будучыні.

Тыдзень таму на старонках «Звязды» я вызначыў агенду, якая будзе мець галоўнае значэнне на парламенцкіх выбарах у верасні 2012 года.

Першы пункт — стратэгія выжывання Беларусі ў абставінах другой хвалі глабальнага фінансава-эканамічнага крызісу.

Другі пункт — стратэгія Беларусі ў інтэграцыйных працэсах на постсавецкай прасторы.

Трэці пункт — стратэгія сацыяльнага развіцця Беларусі ў абставінах пагаршэння фінансава-эканамічнай сітуацыі.

На сённяшні дзень ніводная з беларускіх палітычных груповак публічна не абазначыла сваю пазіцыю ў дачыненні да гэтых трох пунктаў. Больш за тое, другая хваля фінансава-эканамічнага крызісу сёння не абмяркоўваецца ў беларускай палітычнай прасторы, не з'яўляецца прадметам палітычнай дыскусіі. І гэта вельмі трывожны знак.

Але з агульных палітычных пазіцый, якія займаюць беларускія грамадска-палітычныя структуры, мы можам рабіць нейкія высновы.

Я ўжо пісаў, што найбольш моцныя і актыўныя пазіцыі на выбарах 2012 года займаюць праўладныя і прарасійскія структуры. Чаму ў гэтым спісе няма празаходняй апазіцыі? Чым сёння абумоўлена яе кволасць?

Перш за ўсё — тым самым глабальным фінансава-эканамічным крызісам і таксама крызісам Еўрасаюза. Галоўны лозунг празаходніх сіл — далучэнне Беларусі да Еўрасаюза — на сённяшні дзень не адпавядае эканамічным і геапалітычным рэаліям еўрапейскага жыцця. Такой жа неадэкватнай выглядае і стратэгія набліжэння да Бруселя без далучэння да ЕС — шлях, якім у той ці іншай ступені ідуць Сербія, Малдова і Украіна. Адным словам, у празаходняй апазіцыі ў Беларусі няма і не можа быць праграмы. Бо сам Захад яшчэ не ведае, якая ў яго праграма. Напрыклад, той скандал, які зараз скалануў банкаўскі сектар Вялікабрытаніі, можа мець стратэгічныя вынікі, якія радыкальна зменяць саму сутнасць эканамічнай палітыкі найбольш значных краін Захаду. У гэтых абставінах школьны лібералізм апазіцыі выглядае анахранізмам.

У чым моц прарасійскай апазіцыі? У тым, што яна абапіраецца на адну з тэндэнцый, уласцівых для перыяду крызісаў: на схільнасць краін аб'ядноўвацца перад пагрозай эканамічных і палітычных узрушэнняў. Прарасійская апазіцыя выступае за хуткае стварэнне Еўразійскага саюза як адказ на ўсё больш небяспечныя пагрозы з боку глабальнага рынку і нестабільнай міжнароднай сітуацыі. І гэта сапраўды адпавядае не толькі расійскім інтарэсам, але і беларускім. Больш за тое, такую ж пазіцыю займае і кіраўнік беларускай дзяржавы: Аляксандр Лукашэнка з'яўляецца адным з найбольш перакананых прыхільнікаў еўразійскай інтэграцыі. Такім чынам, можна сказаць, што прарасійская апазіцыя спрабуе перахапіць «інтэграцыйную» карту ў самой улады.

Чаму ж тады мы называем гэтую палітычную сілу апазіцыяй?

Таму, што гэтую інтэграцыйную стратэгію адпаведныя палітычныя структуры здзяйсняюць па сцэнарыі, які адпавядае інтарэсам, перш за ўсё, буйнога сыравіннага капіталу. Сутнасць яго ў тым, каб пазбавіць беларускае кіраўніцтва асноўных рэсурсаў (эканамічных і палітычных) і самой мець магчымасці актыўна ўплываць на інтэграцыйныя працэсы, знішчыць цэнтр прыняцця рашэнняў у Мінску. І ў гэтым сцэнарыі сам удзел прарасійскай апазіцыі ў выбарах, па магчымасці, паспяховы, ёсць неабходны крок да яго рэалізацыі.

Але ж сапраўдная праблема з гэтай стратэгіяй прарасійскіх апазіцыйных сіл — у тым, што і расійскае кіраўніцтва сёння не мае сваіх адказаў на пытанні, якія ўздымае глабальны крызіс.

**Юры ЦАРЫК,**
**палітычны аналітык,**
**кіраўнік Грамадскага**
**прэс-цэнтра Дома прэсы**

■ Прамая лінія

## ПЫТАННЕ ДА ЭНДАКРЫНОЛАГА

Прафілактыку і лячэнне захворванняў эндакрыннай сістэмы (цукровы дыябет, хваробы шчытападобнай залозы) можна будзе абмеркаваць падчас «прамой лініі» з **загадчыцай аддзялення эндакрыналогіі 1-й гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска Наталляй Міхайлаўнай ЛІХАРАД**. «Прамая лінія» з яе удзелам адбудзецца ў рэдакцыі газеты «Звязда» **24 ліпеня з 15.00 да 16.00 па нумарах: 8 (017) 292 38 21 і 292 38 92**.

Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумары **8 (017) 292 21 03.**

# Гейзеры ў Круглым

**У раённым цэнтры Круглае адкрыўся сучасны басейн з гейзерам, вадаспадам і прылiўнай хваляй. Гэта частка гандлёва-гасцінічнага комплексу «Ізумруд», які належыць мясцовай ПМК № 266.**

Кошт квіткоў — 14 тысяч рублёў для дарослых і 10 тысяч рублёў для дзяцей. Супрацоўнікі Круглянскай ПМК маюць магчымасць набыць абанементы са зніжкамі. Кажуць, што ахвотнікаў паплаваць у новым басейне зашмат. Як сваіх, мясцовых, так і турыстаў. Цяпер у «Ізумрудзе» 12 гасцінічных нумароў, з іх 3 — пентхаусы, і ўсе яны не пустуюць.

Гасцей у Круглае прываблівае таксама навамодная крыасаўна, наведванне якой замяняе працяглае загартоўванне арганізма. Днямі ў цэнтры адкрываецца і спелеа-пакой.

Паспяхова працуе ў межах комплексу «Ізумрудны гарадок» з атракцыёнамі для дзяцей. У Круглянскай ПМК-266 нават не чакалі, што гэты праект будзе такі даходны: за месяц прыбытак склаў 28 мільёнаў рублёў.

**Ілона ІВАНОВА.**

НАВІНЫ

## ВЫЕЗД ЗА МЯЖУ — З ДАЗВОЛУ КІРАЎНІКА ЎСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ

**У Беларусі адменены парадак узгаднення з Міністэрствам адукацыі пытанняў накіравання навучэнцаў за мяжу на працягу навучальнага года. Адпаведная норма замацавана пунктам 2 артыкула 17 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб супрацьдзеянні гандлем людзьмі».**

Як тлумачыць прэс-служба галоўнага адукацыйнага ведамства, з 25 ліпеня 2012 года накіраванне навучэнцаў за мяжу для ўдзелу ў спартыўных, культурных і іншых масавых мерапрыемствах, а таксама для навучання будзе ажыццяўляцца з пісьмовага дазволу кіраўнікоў арганізацый, у якіх тыя навучаюцца. Такія дазволы будуць афармляцца ў выглядзе ўнутранага загаду і іншых распарадчых дакументаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

ПАДЗЕІ

## 17-ГАДОВАЯ МІНЧАНКА ЗАГІНУЛА, НАГЛЫТАЎШЫСЯ ТАБЛЕТАК?

**Труп дзяўчыны знайшлі ў яе ж кватэры на вуліцы Громава раніцай 15 ліпеня. Па адной з версій следства, прычынай смерці маглі стаць 7 таблетак клоназепаму (моцны супрацьсутаргавы прэпарат), якіх недалічыўся яе нарказалежны хлопец. Менавіта ён і выклікаў медыкаў і міліцыю.**

Як паведаміў афіцыйны прадстаўнік упраўлення Следчага камітэта па Мінску Аляксандр Герасімаў, напярэдадні вечарам маладыя людзі пасварыліся. Сыходзячы з кватэры дзяўчыны, хлопец, які пад наглядам урачоў прымае некаторыя медыцынскія прэпараты, забыўся куртку. У кішэні апошняй знаходзіліся таблеткі трамадолу і клоназепаму, а таксама рэцэпт, па якім яны былі набыты. Раніцай малады чалавек вярнуўся, каб памірыцца, але знайшоў дзяўчыну мёртвай... Яе бацькоў у гэтыя дні дома не было.

**Надзея ДРЫЛА.**

ФАКТЫ

## У МІНСКУ ПРАМЫСЛОВЫ АЛЬПІНІСТ СТРАЦІЎ ПРЫТОМНАСЦЬ НА ВЫШЫНІ 12-ГА ПАВЕРХА

**Пра гэта паведамілі БелТА ў МНС Беларусі.**

Учора, каля 15.30 на ўзроўні 12-га паверха шматпавярховага жылога дома па вуліцы Сухараўскай знепрытомнеў прамысловы альпініст (1972 года нараджэння), які вёў работы па вонкавай ізаляцыі дома. Мужчына самлеў і вываліўся з аднамеснай альпінісцкай люлькі, павіснуўшы на страхавачным тросе. Гэта заўважыў выпадковы мінак, які і выклікаў выратавальнікаў. Работнікі МНС пры дапамозе пажарных лесак спусцілі рабочага з 27-метровай вышыні. На зямлі мужчыну перадалі брыгадзе хуткай дапамогі.

**Кар. БелТА.**


**Извещение о проведении 17 августа 2012 года торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»**

(система кабельного телевидения (СКТВ на 10 000 абонентов))

| Предмет торгов | Наименование продаваемого имущества | Количество (шт.), протяженность (км) |
|---|---|---|
| | 1. Станция головная СГ-312 | 1 |
| | 2. Модулятор телевизионный МТ-300 | 6 |
| | 3. Станция антенная СА-306 | 1 |
| | 4. Усилитель магистральный УМ-301 | 76 |
| | 5. Усилитель магистральный УМ-302 | 2 |
| | 6. Усилитель домовой УД-301 | 149 |
| | 7. Ответвитель магистральный ОМ-301, 302 | 385 |
| | 8. Разветвитель абонентский РА-304 | 2642 |
| | 9. Блок питания дистанционный БП-300 | 7 |
| | 10. Аттенюатор телевизионный АТ-3,1 | 13 |
| | 11. Антенна телевизионная приемная АТКГ | 4 |
| | 12. Кабель РК 75-4 | 0,55 |
| | 13. Кабель РК 75-9 | 18,86 |
| | 14. Кабель РК 75-11 | 5,0 |
| | 15. Кабель РК 75-13 | 1,065 |
| | 16. Кабель РК 75-17 | 25,85 |

| | |
|---|---|
| **Местонахождение продаваемого имущества** | г. Минск, ул. Мичурина, 19 |
| **Сведения о продавце** | ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск, тел. 217 23 98 |
| **Сведения об организаторе торгов** | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, тел. 327 48 36 |
| **Начальная цена предмета торгов** | 1 132 500 977 белорусских рублей |
| **Сумма задатка** | 110 000 000 белорусских рублей |
| **Сведения об обременениях** | Аренда |

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского Кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «МАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также предоставившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного поручения о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Наивысшая цена фиксируется в протоколе о результатах аукциона и включает НДС.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в течение срока, указанного в договоре купли-продажи. Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Торги состоятся **17 августа 2012 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 18.07.2012 по 15.08.2012** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 327 48 36 (УП «Минский городской центр недвижимости),**
**(017) 217 23 98 (ОАО «МАЗ»).**



**ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ ЗАСТРОЙЩИКА №1 от 17.07.2012**

**Сведения о застройщике:** Совместное общество с ограниченной ответственностью «Лада ОМС – Инжениринг» (СООО «Лада ОМС – Инжениринг»). СООО «Лада ОМС – Инжениринг» является универсальным правопреемником СП «Лада ОМС – Холдинг» ЗАО.

**Местонахождение:** г. Минск, ул. Грушевская, 91, пом. 2Н, комн. 3а.

**Режим работы:** рабочие дни с понедельника по пятницу с 8.30 до 19.00, суббота с 09.00 до 15.00; выходной день – воскресенье.

**Данные о государственной регистрации:** зарегистрировано Минским горисполкомом в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №191118730.

**Сведения о проектах жилых домов,** введенных в эксплуатацию за последние 5 лет:

1. 9-этажный 5-секционный 175-квартирный жилой дом №91 на ул. Грушевской в г. Минске;
2. 15-17-этажный односекционный 82-квартирный жилой дом №15 на ул. Маяковского в г. Минске со встроенно-пристроенными помещениями подземного гаража-стоянки, магазина и аптеки;
3. 7-этажный 5-секционный 135-квартирный жилой дом №3 на ул.Щорса;
4. 15-этажный односекционный 89-квартирный жилой дом №8 на 3-й ул.Щорса.

**Цель проекта** – строительство объекта «Комплекс многоэтажных жилых домов с объектами общественного назначения на территории в границах ул. Маяковского, ул. Оранжерейной, ул. Луговой, пер. Полевой со сносом существующей усадебной жилой застройки в границах ул. Маяковского, ул. Аранской, ул. Денисовской, р. Свислочь и выделением 1-ой очереди многоэтажный жилой дом со встроенно-пристроенными объектами административно-общественного назначения. Жилой дом № 6 по генплану» с привлечением денежных средств граждан и юридических лиц путем заключения договоров создания объектов долевого строительства.

**Сведения о сроках реализации:**

Начало строительства – июль 2012 г.

Ввод объекта в эксплуатацию – сентябрь 2014 г.

У Застройщика имеются:

- решение Мингорисполкома о разрешении строительства от 21.06.2012 № 1968;
- проектно-сметная документация, прошедшая в установленном порядке государственную экспертизу в РУП «Главгосстройэкспертиза» (заключение от 04.11.2011 № 892-15).

**Местонахождение строящегося объекта**: г. Минск, территория в границах ул. Маяковского, ул. Оранжерейной, ул. Луговой, пер. Полевой.

**Количество предлагаемых для заключения договоров создания объектов долевого строительства.**

По жилому дому:

-1-комнатные - 15 шт.

-2-комнатные - 15 шт.

-3-комнатные - 15 шт.

**Цена одного квадратного метра** общей площади жилых помещений (без отделки) составляет:

- 1-комнатные квартиры – 1420 долларов США в эквиваленте в белорусских рублях по курсу НБ РБ на день оплаты;
- 2-комнатные квартиры – 1390 долларов США в эквиваленте в белорусских рублях по курсу НБ РБ на день оплаты;
- 3-комнатные квартиры – 1390 долларам США в эквиваленте в белорусских рублях по курсу НБ РБ на день оплаты.

Платежи по договору создания объекта долевого строительства осуществляются с пересчетом долларового эквивалента в белорусские рубли по курсу, установленному Национальным банком Республики Беларусь в день оплаты.

**Данные о правах застройщика на земельный участок:** земельный участок предоставлен застройщику решением Мингорисполкома от 21.06.2012 № 1968 площадью 0,6538 га.

**Элементы благоустройства:** создаются площадки для отдыха, детская площадка, газоны, озеленение; покрытие проездов к дому – двухслойный асфальтобетон, тротуаров – мелкоразмерная плитка, дорожек и площадок – спецсмесь и плитка.

**Предполагаемый срок ввода дома в эксплуатацию –** сентябрь 2014.

**Сведения о договорах строительного подряда:**

договор подряда с ЧСУП «Стройпарнас» № 02/04-12 от 02.04.2012 г.

**Условия ознакомления с информацией по проекту:**

тел.: 8-017-220-40-43, VELCOM 8-029-699-40-93, 8-029-699-40-32; на сайте http://www.lada-park.by/ либо по адресу: г. Минск, ул. Грушевская, 91, пом. 2Н, комн. 3а.




# ПАМАГАЙ, СВЯТЫ ЯНЕ!

## Святая вада глыбоцкай глыбінкі

**Вёска Бабруйшчына на Глыбоччыне — сапраўдная глыбінка. Сюды не вядуць асфальтавыя дарогі, і па ёй не праносяцца імклівыя аўто. Тым не менш яна не забытая і дарогі тутэйшыя не зарастаюць. Час ад часу і тут назіраюцца аўтамабільныя заторы. Асабліва ў дзень, калі ля крыніцы адзначаецца святы Ян. Як раней казалі — «на кірмаш».**



Фэст-кірмаш у Бабруйшчыне мае больш як стагадовую традыцыю асвячэння вады і кветак. Раней у гэты дзень тут было вельмі людна і «конна». Цяпер, адпаведна часу, — «машынна». Толькі адышлі ў нябыт тыя непаўторныя кірмашы з іх асаблівым настроем, вясёлым гоманам і цукровымі пеўнікамі на палачках. Але крыніца па-ранейшаму б'е з-пад царкоўнай гары і нясе сваю чысцюткую святую ваду за сотні кіламетраў — у Балтыку і Атлантыку.

Сваёй вады ў Бабруйшчыне, як кажуць, багата — пяць азёраў вакол! Адно з іх — Белае — з'яўляецца нават заказнікам. Але склікае ўсіх менавіта гэты маленькі халодны струменьчык, над якім з незапамятных часоў стаіць каплічка са старажытнай драўлянай фігурай апекуна — святога Яна. А ўсе разам — гэта нешматлікія жыхары і дачнікі самой Бабруйшчыны, насельнікі суседніх і крыху аддаленых навакольных вёсак. Не толькі праваслаўныя (бо гэта іх дзень), але і католікі: вада не выбірае людзей па веры і перакананнях, яна — для ўсіх аднолькавая. Галоўнае — верыць у яе цуд. І тады яна дапаможа.

Па гэтую дапамогу прыйшла з вёскі Баяры Уладзіслава Рудак, якая нарадзілася ў час вайны. Упершыню пятнаццацігадовай яна наведалася ў Бабруйшчыну, маладою хадзіла на споведзь. А старэйшая ўдзельніца сёлетняга фэсту — 85-гадовая жыхарка вёскі Перадолы Аляксандра Марцынкевіч — хадзіла ў Бабруйшчыну ў школу яшчэ пры Польшчы (да 1939 г.). Рэдка калі прапускала фэсты — толькі ў час вайны. Яе, без перабольшвання, можна назваць захавальніцай традыцыі асвячэння крыніцы і збірання зёлак.

«Павінна быць дзевяць зёлак. Яны ў гэты час робяцца лекавымі. Гэтак павялося ад нашых бабуль, — кажа Аляксандра Паўлаўна. — Кветкі кладзём за абразок у хаце, каб сохлі».

— Гэтымі кветкамі мы абкурваем хаты, лечым дзяцей ад спуду, — далучаецца да размовы яшчэ адна даўнейшая наведвальніца крыніцы, жыхарка вёскі Хролы 83-гадовая Таццяна Барысаўна Хосталь.

Вёска Хролы знаходзіцца за дзесяць кіламетраў, на беразе возера Шо. Таццяна Барысаўна павязе асвячоныя кветкі сваім аднавяскоўцам, ваду — сыну і ўнукам. Цэлы год вада будзе стаяць, як свежая.

Дзіўная гісторыя ў Янавай крыніцы. Царкву над ёю, калі верыць аповедам вяскоўцаў, узвёў пан Буйніцкі ў памяць аб сваёй дачцэ, якая памерла ад сухотаў. Пасля вайны ў царкве была турма. Пасля аднаўлення святыня зноў дзейнічае. А драўляную скульптуру святога Яна — помнік народнага мастацтва — колішнія кіраўнікі-атэісты намагаліся ўтапіць у Ксяндзовым возеры (у яго ўпадае крыніца), але мясцовыя жыхары паўсталі на абарону свайго духоўнага ахоўніка.

— Царква і крыніца — адзінае цэлае, — кажа святар з Падсвілля Вячаслаў Пяшко. — Маліцца тут лёгка і добра.

— Памажы нам, святы Ян! — услед за святаром кажуць удзельнікі фэсту.

Памажы, Яне! — просіць кожны, хто схіляецца над стромкім халодным струменьчыкам.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

*Глыбоцкі раён.*

**На здымках:**

**✓ Хрэсны ход з абразом Яна Хрысціцеля.**

**✓ Спроба пазбавіцца ад усіх хвароб — пахадзіць па вадзе басанож.**

**✓ Фларыян Іванавіч АТВАЛКА з вёскі Галубічы смакуе ваду ў капліцы святога Яна.**

**✓ Святаслаў САВУЛІН прыехаў з Маладзечна ў в. Перавод і наведаў крыніцу.**







# ЁСЦЬ «БАЗАРНЫ» РЭКОРД ГІНЭСА!

**Падзея гістарычнага значэння адбылася на «базары» — упершыню ў Беларусі быў пастаўлены рэкорд для Кнігі рэкордаў Гінэса ў падняцці гір. Аўтар дасягнення — 65-гадовы выхадзец з Беларусі Анатоль Мікалаевіч Яжоў. Дарэчы, ён адзіны ў свеце спартсмен гіравога спорту, які раней паставіў ажно тры сусветныя рэкорды Гінэса, 777 сусветных рэкордаў у 115 экстрэмальных месцах усіх частак свету, дзе ўздымаў сцягі Расіі і Беларусі.**



Анатоль Мікалаевіч паставіў новы сусветны рэкорд Кнігі рэкордаў Гінэса ў намінацыі «жым лежачы дзвюх гір па 22 кг папераменна на працягу хвіліны». І за гэтую хвіліну ён падняў гіры 140 разоў (у выніку 3080 кг)!

Рэкорд асабіста зафіксаваў спадар Джэк Брокбэнк, спартыўны камісар, прадстаўнік Кнігі рэкордаў Гінэса.

Анатоль Яжоў — чалавек унікальны. Наш зямляк — 50-разовы чэмпіён свету, 50-разовы чэмпіён Еўропы, 45-разовы чэмпіён Расіі!.. Ён — прэзідэнт міжнароднага Інстытута кіравання (горад Архангельск), прэзідэнт Міжнароднай «Лігі развіцця навукі і адукацыі», член Расійскага саюза рэктараў, прафесар, доктар эканамічных навук, уганараваны ён і многімі іншымі тытуламі і званнямі.

У адным з наступных нумароў чытайце матэрыял па выніках размовы з гэтым унікальным чалавекам, а таксама з камісарам Кнігі рэкордаў Гінэса, які раскрыў сакрэт дзейнасці славутай кнігі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# Азёры, тэхналогіі і знакамітасці

**Менавіта ў гонар гэтых (на першы погляд не звязаных адзін з адным) паняццяў назвалі дзесяць новых вуліц Мінска.**

Прапанову адносна назваў, дадзеную Мінгарвыканкамам яшчэ ў сакавіку, днямі зацвердзілі дэпутаты Мінгарсавета. Цяпер некаторыя жыхары сталіцы змогуць пазначаць у сваіх адрасах вуліцы Браслаўскую, Княгінскую, Камайскую, Мястраўскую ці Ільянскую. Як патлумачылі ва ўпраўленні культуры Мінгарвыканкама, вышэйпазначаныя назвы паходзяць ад назваў беларускіх азёр і населеных пунктаў. Таксама з'явяцца вуліцы імя герояў Сталінграда, курсанта Гвішыяні, акадэміка Карскага і Юрыя Семянякі, якія нагадваюць пра знакавыя гістарычныя падзеі (70 гадоў з дня Сталінградскай бітвы) і вядомых асоб (Гвішыяні загінуў напрыканцы дзевяностых, ратуючы палаючы цягнік пад Драгічынам, Карскі — знакаміты этнограф і філолаг, а Семяняка — кампазітар). А вось вуліца Праграмістаў з'явілася дзякуючы Парку высокіх тэхналогій, будынкі якога знаходзяцца там. Прапанавалі такую назву менавіта прадстаўнікі гэтай установы.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

# А вы ўжо рыхтуецеся... да школы?

**Яшчэ звініць водгалас школьных выпускных вечароў, а для некаторых надыходзіць час думаць пра новы навучальны год. Хтосьці пачынае прыглядацца да набораў сшыткаў і іншых школьных прыладаў ужо цяпер. З адной з такіх прадбачлівых матуль, Настассяй Шык, у якой дачка Саша сёлета пойдзе ў першы клас, мы выбраліся па школьныя пакупкі.**

Фота Аляксандры ЛІТВІНЧЫК.



— *Вырашыла цяпер набыць некаторыя канцтавары,* — тлумачыць Настасся. — *Бліжэй да восені на гэта не будзе часу, ды й чэргаў пакуль што няма — можна купіць усё за дзесяць хвілін.*

Спадарыня Настасся кажа, што не шукае месцаў, дзе можна набыць тавары па мінімальнай цане. Калі ўбачыць нешта патрэбнае — адразу купляе.

— *У школе нам далі цэлы спіс таго, што неабходна набыць да навучальнага года,* — паказвае Настасся пералік з трох дзясяткаў пунктаў. — *Некаторыя складнікі я выкрасліла, бо мы дарылі іх дзеткам на выпускны ў садку, і да школы вырашылі іх не кранаць. Дачцэ толькі пакажы новыя рэчы, яна адразу хоча іх скарыстаць,* — усміхаецца Настасся. — *І так пастаянна пытаецца: «Ну калі мы ўжо ў школу пойдзем?»*

Адразу адпраўляемся ў «Куток школьніка», што размясціўся на першым паверсе ў ЦУМе. Там вырашана набыць, па магчымасці, усё, што прадстаўлена ў спісе: сшыткі ў буйную клетку і лінейку, блок для чарчэння, набор гуашавых фарбаў з дванаццаці колераў, клей-аловак і ПВА, дошку для лепкі, кубачак-непралівайку, два пэндзлі, расфарбоўку, ручкі, алоўкі... Усяго канцылярскіх «дробязяў» набралася на 121 500 рублёў. І гэта яшчэ не ўсё. Асобна Настасся набыла папку з файламі за 17 500 рублёў, а кніжку для чытання па складах так і не знайшла...

У секцыі са школьным адзеннем людзей пакуль што няшмат, хаця лінейка тавараў прадстаўлена ў вялікім аб'ёме. Цэны розныя. Так, можна пабачыць хлапчуковыя касцюмы-«двойкі» і па 396 000, і па 561 000. Ёсць дзявочыя сарафаны коштам як па 198 000, так і па 283 000. Людзі пакрысе звяртаюць увагу на школьную форму, але набываць не спяшаюцца: за лета дзеці вырастаюць. А Настасся ўвогуле не будзе купляць форму для дачкі.

— *У школе патрабуюць дзелавы стыль адзення. Я паглядзела на прадстаўленыя мадэлі, і мне стала сумна. Безумоўна, касцюмаў шмат, і вытворцы стараюцца прытрымлівацца патрабаванняў: каб нічога ў адзенні не адцягвала ўвагі школьніка, каб было зручна і па кішэні бацькам... Але няма разнастайнасці! Я хацела б, каб маё дзіця было апранута крыху па-іншаму. Па адукацыі я дызайнер-мадэльер, таму буду шыць дачцэ строі сама. Да таго ж некаторыя рэчы застаюцца нам ад пляменнікаў, якія хутка з іх вырастаюць.*

Я пацікавілася ў Насці пра розніцу ў цэнах: можа, сапраўды больш выгадна шыць строі самому, чым набываць гатовыя?

— *Я звярнула ўвагу на адзін касцюм для дзяўчынкі: спадніца і жакет каштуюць 175 000. У прынцыпе, гэта нармальна. Калі будзеш шыць сам з сінтэтычных тканін, амаль тое і атрымаецца. Хіба што за працу сам сабе плаціць не будзеш. Калі выкарыстоўваць даражэйшыя натуральныя тканіны для адзення, то ўвогуле ніякай эканоміі не будзе.*

Спецыяльна асобны «бюджэт» для таго, каб сабраць дачку ў школу, Насця не планавала. Бо набыць усе неабходныя тавары — гэта яшчэ палова справы. Самыя вялікія выдаткі чакаюцца з наступленнем навучальнага года...

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**

# ЛЯСНЫ БІЗНЭС

## Водпуск у лесе

Наплылі хмары, заблішчэлі маланкі, пачаўся дождж. Гэта звычайная пагодная з'ява, якая цяпер вельмі радуе гараджан у іх асфальта-бетоннай спякоце, выклікае іншыя эмоцыі ў вяскоўцаў. З аднаго боку, дождж выгнаў грыбнікоў і ягаднікаў з лесу, а з іншага — ёсць гарантыя, што заўтра будзе нашмат больш грыбоў.

А пакуль у вароты да Ягораўны ўваходзяць жанчыны з дзіцем. Усе — з вёдрамі. У адным вядры — лісічкі, у другім — чарніцы. І нават хлопчык цягне ў маленькім вядзерцы трохі ягад.

— Мы пабылі ў лесе толькі гадзіны тры з-за дажджу, але назбіралі нешта, і грошы атрымаем, — усміхаецца жанчына і лічыць грошы. Атрымліваецца каля сотні тысяч, і яна задаволена. — Увогуле, у дзень можна спакойна зарабіць 100-200-300 тысяч рублёў. Як пашанцуе.

**Наталля Мікалаеўна** расказвае, што мае сталую працу, а цяпер пайшла ў законны адпачынак, каб правесці яго з карысцю для сямейнага бюджэту. Увогуле водпуск у лесе — звычайная справа для людзей з Заполля.

— А дачка ў водпуску па доглядзе дзіцяці, прыехала ў госці і таксама часу дарма не губляе: у нас можна зарабіць!



Запольская крама: жанчыны ў чарзе па грошы.

За адпачынак Наталля Мікалаеўна мяркуе зарабіць некалькі мільёнаў рублёў (ад 3 да 5) і набыць для сям'і нешта каштоўнае. Атрымаецца «грыбны» камп'ютар, альбо «сунічны» аўтамабіль, альбо «журавінная» (тут гэтых восеньскіх ягад таксама шмат!) вышэйшая адукацыя, альбо «брусн.чны» рамонт. Такое здараецца, калі да лясных заробкаў падключаецца ўся сям'я — ад малых да старых.

## Грамадская карысць

— Так, усё магчыма, людзі папаўняюць свой сямейны бюджэт, — пацвярджае добрыя сезонныя заробкі **старшыня Запольскага сельскага Савета Яўген РАДОЎСКІ**. — У нас адзін мужчына ўзяў выхадны дзень у гаспадарцы і сабраў лісічак аж на 960 тысяч рублёў. Устанавіў рэкорд збораў мясцовага значэння! Але гэта не проста так: ён добрыя месцы ў лесе ведае і нікому не раскажа, дзе яны. Гэта вялікі сакрэт!

Сам Яўген Іванавіч — адзін з нямногіх мясцовых жыхароў, які не збірае дары лесу на продаж, а толькі для сябе. Клопатаў шмат, вольнага часу мала. А калі ён ёсць — лепш адпачыць у лесе, падсілкавацца біяэнергіяй, а не працаваць. Аднак старшыня сельскага Савета любыя захады па нарыхтоўцы горача падтрымлівае.

— Справа ў тым, што нарыхтоўшчыкі плацяць 5% падатку ў бюджэт сельсавету, — задаволена растлумачыў ён. — Таму мы зацікаўлены ў тым, каб людзі як мага больш збіралі і здавалі. І ім добра, і нам. Летась мы зарабілі на гэтым 27 мільёнаў рублёў, але той сезон быў не лепшым: здаралася і 32, і 35 мільёнаў атрымаць. Усе грошы — на развіццё тэрыторыі, навядзенне парадку: нам удалося, напрыклад, зрабіць прыстойную агароджу на большасці могілак.

## Сінія рукі

**Сёння за кілаграм лісічак плацяць 20 тысяч рублёў, за кілаграм суніц — 22 тысячы.** Цэны ў камерсантаў і кааператараў прыблізна аднолькавыя. Куды здаваць — справа густу. Многія аддаюць перавагу кропкам, якія месцяцца побач з домам. Але большасць — усё ж такі сельскай спажывецкай краме, дзе можна адразу, не выходзячы з адной чаргі, набыць патрэбныя тавары.

Сапраўды, самая вялікая чарга здатчыкаў чарніц і лісічак — **у мясцовай краме Бялыніцкага раённага спажывецкага таварыства.** Хто прыйшоў з лесу пешшу, хто прыехаў кампаніяй на колах. Жанчыны ставяць на вагі вёдры з грыбамі і ягадамі, тут жа атрымліваюць грошы.

— У мяне пенсія 1,2 мільёна рублёў, — адкрывае няхітрую арыфметыку **пенсіянерка Валянціна Міхайлаўна**. — А тут, пайшоўшы ў лес да абеду, магу больш за 100 тысяч рублёў зарабіць. Добрая прыбаўка!

**Ірына Шарыпава** прыйшла з двума вялікімі вёдрамі суніц і атрымала 375 тысяч рублёў.

— Ад рання і да абеду збірала, сваімі рукамі, — жанчына паказала сінія рукі, якія ўжо не адмываюцца ніякімі мыйнымі сродкамі. — Можна яшчэ і другую ходку зрабіць, пасля абеду. Я ў гэтым сезоне хачу за «лясныя» грошы ўсталяваць у доме сучасныя шклопакеты. Летась заплаціла за адпачынак дзіцяці ў замежжы, набыла ўсё неабходнае ў школу.

Жанчыны радуюцца прыбытковаму лету: сезон пачынаецца з чарніц і заканчваецца журавінамі. Здаюць усё, што прымаюць, у тым ліку і з падсобных гаспадарак.

— На ягадах можна зарабіць больш, чым на асноўным месцы працы, — не ўтойваюць яны.

## Пакланіцца кожнай ягадцы

Ад таго, якія сумы называюць грыбнікі і ягаднікі, у гараджаніна з невялікім фіксаваным заробкам кружыцца галава. Часам падаецца, што ўсё так проста — пайшоў у лес і наскуб грашовых знакаў. Але гэта зусім не так. Трэба не проста ведаць грыбныя і ягадныя месцы, трэба яшчэ пакланіцца кожнай сунічцы і кожнай лісічцы. Каб зарабіць грошы — трэба папрацаваць.

— Мы з дзяцінства прывучаны да гэтага, але збіраць дары лесу — гэта ўсё ж нялёгкая праца, — абдымае сваё каштоўнае вядро з лісічкамі на ганку крамы Людміла Казлова. — Трэба і шмат кіламетраў прайсці, і спіну пагнуць.

Між тым, большасць не скардзіцца на цяжкую лясную працу, а радуецца магчымасці зарабіць.

— Ягады збіраеш — навокал цішыня і спакой, птушкі спяваюць. Можна сказаць, што гэта таксама расслабленне і адпачынак, — усміхаецца аптымістычная Ірына Шарыпава.

— Сабраў слоік суніц — ужо 10 тысяч рублёў, сабраў другі — яшчэ столькі ж, — жартуюць пра сваю «медытацыю» сялянкі. — Так і думаеш, так паступова і рухаешся далей, да вялікіх прыбыткаў.

## Урадлівы год

Скрыні з дарамі лесу стаяць прама ў гандлёвай зале крамы. Іх штодня забірае аўтамабіль спажывецкай кааперацыі.

**Дарэчы, у лесагаспадарчым аб'яднанні абяцаюць праводзіць рэйды супраць тых, хто збірае ягады так званымі «камбайнамі». Пазнаць сабраную камбайнам ягаду проста: там будзе шмат лісця. Спецыялісты лічаць гэта варварскім спосабам. «Камбайны» наносяць ягаднікам такую шкоду, што аднаўленчы перыяд можа зацягнуцца на некалькі гадоў. Супраць тых, хто наносіць урон прыродзе, і на захаванне лясных багаццяў і скіраваны рэйды лясной гаспадаркі на працягу ўсяго сезона збору ягад.**

— Сёлета мы ўжо нарыхтавалі каля тоны чарніц, больш за 600 кілаграмаў лісічак, — хваліцца **прадавец Ніна Амялькова**. — Сезон у самым разгары, хутка яшчэ і яблыкі пойдуць. Да нас ідуць добра, таму што я ўжо 30 гадоў працую ў гандлі, усіх людзей тут ведаю і да ўсіх стаўлюся з павагай. Праўда, сама ў лес не хаджу: няма часу, штодня на працы ў важны сезон нарыхтовак.

— Мы цэны можам пераглядаць і двойчы на дзень, — паведаміла **намеснік старшыні праўлення Бялыніцкага раённага спажывецкага таварыства Раіса РУМЯНЦАВА**. — Гэта канкурэнцыя, і мы сапраўды імкнёмся не страціць ніводнага кілаграма грыбоў і ягад. У нас створаны спецыяльны штаб, які аператыўна інфармуе насельніцтва.

Цэны цяпер дастойныя, лічыць Раіса Іванаўна як спецыяліст, адказны за нарыхтоўкі. Стабільна даражэюць ягады, таму што ідуць на экспарт.

— Сезон сёлетні больш удалы, чым леташні, — лічыць Румянцава. — Мы ў 2011 годзе ўвогуле нарыхтавалі 20 тон чарніц, а цяпер — ужо столькі ж, хоць збор гэтай ягады далёка не завершаны. І грыбоў сёлета больш: мы ў раёне нарыхтавалі ўжо 1,5 тоны, а гэта ўтрая больш за мінулы сезон. Мы даём людзям зарабіць і самі зарабляем.



У Заполлі зарабляюць на грыбах і ягадах сем'ямі — ад малых да сталых.

## Выйшаў з лесу

Каб зарабляць больш, спажывецкая кааперацыя зрабіла **перасовачныя нарыхтоўчыя пункты**. Адным з іх кіруе **Віктар Накуеў**, які са сваім мікрааўтобусам паркуецца якраз прама каля лесу.

— Людзі з лесу выходзяць, здаюць прадукцыю, адразу атрымліваюць грошы, — гаворыць нарыхтоўшчык. — Я па графіку аб'язджаю тры месцы, а потым яшчэ, здараецца, па тэлефанаваннях забіраю грыбы ды ягады ў людзей адразу з дому. Мне патрэбен план — бо гэта ж мой заробак таксама!

Віктар Анатольевіч паказвае скрыні ў мікрааўтобусе і выказвае ўпэўненасць, што сёлетні план ён нават перавыканае і атрымае жаданую прэмію. Ён, са свайго боку, рады і дапамагчы людзям: дастаўляе да лесу ваду, малых дзяцей падвозіць дадому ў Бялынічы. Таму што лясная праца — таксама і дзіцячая. Вось з лесу выйшаў хлопчык у спартыўным строі, з вядром у руках. Школьнік на законных канікулах зарабляе сабе... найперш на марозіва.

— Што захачу — тое і набуду, — упэўнена гаворыць Барыс. — Удасца зарабіць на ўсё, калі імкнуцца.

Тэхналогія хуткая: высыпаў ягаду ў скрыню на электронныя вагі — і адразу атрымаў на рукі 74 тысячы рублёў.

— Кожны дзень я выплачваю прыкладна 15 мільёнаў рублёў, — гаворыць Віктар Накуеў. — Людзі радуюцца, асабліва калі цана добрая. Ну што ж, яшчэ тыдзень таму за кілаграм чарніц плацілі 13 тысяч рублёў, а цяпер — 22 тысячы. Лясны бізнэс для людзей выгадны.

**Ілона ІВАНОВА. Фота аўтара.**

*Бялыніцкі раён.*



Людміла Казлова на ганку крамы расказвае пра паклоны кожнаму грыбку і кожнай ягадцы.

*Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.*

■ Лінія жыцця

# «ПРОЗВІШЧА МАЁЙ МАЦІ ЗАЛАТЫМІ ЛІТАРАМІ ВЫБІТА НА СЦЯНЕ Ў ІЕРУСАЛІМЕ»

**Два дні народзінаў, дзве маці... Гісторыю пра тое, як простая жанчына са Жлобіна выратавала яго ад смерці, распавёў малалетні вязень гета Барыс Макоўскі.**

Барыс Рыгоравіч нарадзіўся незадоўга да вайны. У яўрэйскай сям'і. Падчас абароны роднага горада ад акупантаў загінуў яго бацька. А ўжо ў верасні 41-га фашысты абцягнулі калючым дротам былы ваенны гарадок, куды і сагналі яўрэяў з усяго Жлобіна. У тым ліку і Барыса разам з мамай, брацікамі і сястрычкамі. Амаль 8 месяцаў сям'я знаходзілася ў гета...

У 1942-м, на яўрэйскую Пасху (якое блюзнерства!), нацысты сагналі палонных у машыны і павезлі на акраіну горада. Лічаныя хвіліны заставаліся да крывавай расправы над маім суразмоўцам. Але лёс распарадзіўся інакш. У момант, калі грузавікі са смертнікамі спыніліся ля чыгуначнага пераезду, маці Барыса са словамі «Ева, выратуй хоць меншага!» нейкім дзівам паспела перадаць свайго сына ў натоўп неабыякавых гараджан.



12 красавіка расстралялі дзвюх сястрычак і двух брацікаў (на даваенным здымку адзін з іх) Барыса Макоўскага.

Пляменнік Евы Мельнікавай схаваў малога ў белым футры пад паліто і што ёсць моцы пабег з ім дадому. Суседзі галасілі, а калона тым часам працягнула свой страшны шлях... Неўзабаве пачулася страляніна... Ева зразумела, што ў гэтага чарнавокага хлопчыка нікога не засталося ў цэлым свеце... І перадала сірату на выхаванне мясцовай актывістцы Ціне Макоўскай. Менавіта гэтую смелую жанчыну Барыс Рыгоравіч па праве называе сваёй другой маці.

**«Мне было 16, калі даведаўся пра ўсынаўленне. Мама сказала няпраўду... Маўляў, яе выклікаў бургамістр Жлобіна і сказаў, што ў паліцыі ёсць дзіця, маці якога загінула».**

— Мама расказвала, што я нагадваў жывы шкілет — шкура ды косці... Яна мяне выхадзіла, адпаіла казіным малаком. Ведала, што ёй пагражае расстрэл за ўкрыццё яўрэйскага дзіцяці (аб гэтым папярэджвалі лісткі, расклееныя на кожным рагу). Тым не менш, працягвала рызыкаваць уласным жыццём, жыццём сваіх блізкіх.

Ад немцаў маленькага Барыса хавалі ў старой бочцы, якая стаяла ў куце ля печкі.

— Мне было строга наказана, калі хто-небудзь стукае ў брамку, імчаць у хату ў схованку, — распавядае Барыс Рыгоравіч. — І вось я аднойчы загуляўся ля кучы пяску... Адарваў погляд ад сваіх замкаў і бачу: побач са мной стаяць два вялізныя боты. Падымаю галаву — немец! Глядзіць на мой занятак і ўсміхаецца. Хацеў ускочыць і бегчы, але ён прытрымаў мяне, пагладзіў па галаве і даў 2 цукеркі. Я бягом у дом: «Мама, мама, немец мне цукеркі даў». Яна хутка выйшла, глянула ўслед і прамовіла: «Табе пашанцавала. Гэта не немец. Гэта Ігар Галавацкі, тут недалёка на кватэры жыве, у камендатуры перакладчыкам працуе».

Пасля вайны Ціна Васільеўна ўсынавіла Барыса, які заўсёды лічыў яе сваёй роднай мамай.

— Мне было 16, калі даведаўся пра ўсынаўленне. Мама сказала няпраўду... Маўляў, яе выклікаў бургамістр Жлобіна і сказаў, што ў паліцыі ёсць дзіця, маці якога загінула. «Вазьмі яго. Напішы абавязацельства, што будзеш яго выхоўваць у новым духу». Яна не хацела, каб я лічыў сябе яўрэем. І каб усе лічылі мяне яўрэем.

Ціна Макоўская памерла ў 1984 годзе. Праз 12 гадоў, у 1996-м, ёй (адзінай у Жлобіне) пасмяротна прысвоена ганаровае міжнароднае званне «Праведнік народаў свету». Прозвішча гэтай бясстрашнай беларускі сёння можна ўбачыць на сцяне-помніку ў Іерусаліме.

**— Барыс Рыгоравіч, пра такіх людзей, як вы, кажуць «народжаны ў кашулі». З амаль 4 тысяч жлобінскіх яўрэяў, якіх везлі на расстрэл 12 красавіка 1942 года, у жывых засталося толькі чацвёра. У тым ліку і вы. Задумваліся, чаму так здарылася?**

— Была такая думка. Напэўна, я Богам пазначаны. Хоць маё камсамольскае, піянерскае выхаванне заўсёды казала, што Бога няма. Потым я стаў думаць сам. Калі Бог ёсць — і рабілася такое, то што б было, калі б Бога не было?

Цяпер Барыс Макоўскі на пенсіі. Жыве з ратвейлерам Боем у доме, пабудаваным сваімі рукамі. І марыць, каб у яго родным Жлобіне з'явіўся пансіянат для адзінокіх старых (глядзіце публікацыю «Мой дом — мая... турма?» ад 12 ліпеня).

— Ёсць у мяне магчымасць пераехаць жыць у Ізраіль, — прызнаецца суразмоўца. — Толькі вось жадання няма. Бо тут, на жлобінскай зямлі, пражыў усё жыццё, тут пахаваны мае самыя дарагія людзі...

Штогод 12 красавіка (гэты дзень лічыць сваім другім днём народзінаў) Барыс Рыгоравіч едзе на месца, дзе расстралялі яго сям'ю, каб пакласці каменьчык. Даглядае і магілку сваёй другой, не менш роднай, мамы, якая не толькі выратавала ад смерці, але і паставіла на ногі...

**Даведка**

*Падчас халакосту ў Беларусі загінула больш за 800 тысяч яўрэяў. Выжыла каля 30 тысяч, многія з іх дзякуючы Праведнікам свету. Пра такіх людзей яўрэйскія мудрацы кажуць:* ***«Той, хто выратаваў чалавека — выратаваў цэлы свет!»***

**Надзея ДРЫЛА**



«Народжаны ў кашулі» праз 70 гадоў пасля выратавання.

■ Кватэрнае пытанне

# ІНТЭРНАТ — НЕ ДОМ...

**Мы з мужам — маладыя спецыялісты, жывём на прыватнай кватэры. Зараз арганізацыя выдзяляе нам пакой у інтэрнаце, але, кажуць, са зняццем з чаргі на паляпшэнне жыллёвых умоў. Ці будзе законным гэткае рашэнне?**

**В. Г.,** *Мінскі р-н.*

Калі гаворка пра зняцце сям'і з чаргі, з уліку тых, **хто хоча атрымаць жылое памяшканне менавіта ў інтэрнаце,** то рашэнне адміністрацыі правамернае. Калі ж наогул...

Пражыванне ў інтэрнаце само па сабе з'яўляецца падставай для прызнання грамадзян асобамі з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў і пастаноўкі іх на кватэрны ўлік. А вось зняць з яго, згодна з «Палажэннем аб парадку ўліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, выдзялення жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду» (зацверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 лістапада 2005 г. № 565) можна, у прыватнасці, у выпадку паляпшэння жыллёвых умоў, калі ў выніку яго адпалі падставы для прызнання грамадзян асобамі з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў.

Такім чынам, калі сям'я знаходзілася на ўліку асоб з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў, то пасля атрымання жылога памяшкання ў інтэрнаце за ёй павінна захавацца права знаходзіцца на ўліку да атрымання жылога памяшкання па вызначаных нормах. Рашэнне аб зняцці з уліку можа быць абскарджана ў судовым парадку.

**Віктар САВІЦКІ**

# «ТАМУ ЗА ГАЗЕТУ Я БОГУ МАЛЮСЯ...»

**Юбілей, паводле слоўніка — гадавіна дзейнасці каго-небудзь (або існавання чаго-небудзь), якая вылічваецца звычайна дзесяцігоддзямі, стагоддзямі і ўрачыста адзначаецца грамадскасцю.**

**Газеце «Звязда» 9 жніўня — 95! Яшчэ не 100... Але ж грамадскасць ужо адзначае. Прынамсі, у пошце ўсё часцей і часцей з'яўляюцца прыгожыя віншавальныя паштоўкі і цёплыя словы. Кшталту:**

*Маю газету, сэрцу дарагую,*
*Я з юбілеем заўтрашнім віншую!*
*Усім падпісчыкам яе і творцам*
*Здароўя зычу, поспехаў бясконцых!*

Гэта, так бы мовіць, — эпіграф, уступ. А цяпер — сам верш, падобны на песню:

***Газета «Звязда» — люстэрка краіны.***
***На першых старонках знойдзеш навіны,***
***А далей — культуру, «Краіну здароўя»***
***І самы дакладны з прагнозаў надвор'я...***
***Тут лёсы людскія, іх досвед багаты,***
***Там гумар народны, адвечныя святы.***
***І горад, і вёска, жыцця панарама,***
***Тут меней, чым дзе, раздражняе рэклама...***
***Бо мова Радзімы жыве на старонках***
***(Пра моладзь цікава піша «Чырвонка»).***
***Вершам і здымкам заўсёды мы рады,***
***Песням, пытанням, адказам, парадам...***
***Таму і чытаю... Ды век не зракуся!***
***Таму за газету я Богу малюся:***
***Прашу тыражоў ёй і шчаснае долі***
***Свяціла каб ярка — не згасла ніколі,***
***Жаданай была ў кожнай сямейцы***
***І мовай лячыла нашыя сэрцы!***

**Фаіна ЦІМАХОВІЧ,**
*мястэчка Івянец, Валожынскі раён.*

**Дадаць да гэтых радкоў як быццам няма чаго. Хіба што кароткае: самае вялікае дасягненне «Звязды» за 95 гадоў жыцця і дзейнасці — яе падпісчыкі, яе чытачы, якія не зракаліся... І, дасць Бог, не зракуцца!**

**Звяздоўцы.**

■ 36,6°

# ЯК ПРЫВЫКНУЦЬ ДА ПРАТЭЗАЎ?

**Зубныя пратэзы ўсіх канструкцый — адначасова лячэбны і прафілактычны сродак. Зробленыя своечасова зубныя пратэзы аднаўляюць парушаныя функцыі жавання і маўлення, папярэджваюць дэфармацыю зубных радоў і захворванні скронева-ніжнясківічных суставаў. Выраз твару пры гэтым не мяняецца. Па першым часе зубны пратэз успрымаецца ў ротавай поласці як іншароднае цела. Гэтае ўспрыняцце знікае па меры прывыкання. Бываюць пратэзы няздымныя, так званыя маставідныя, і здымныя — пласціначныя і бюгельныя.**



— Пацыенты даволі лёгка, праз 1-2 дні, адаптуюцца да няздымных маставідных пратэзаў, — тлумачыць **намеснік галоўнага ўрача 4-й гарадской клінічнай стаматалагічнай паліклінікі г. Мінска Людміла ВЯЧЭРСКАЯ.** — Цяжэй асвойваюцца здымныя пратэзы, асабліва пры поўнай адсутнасці натуральных зубоў на абедзвюх сківіцах. Зразумела, працягласць асваення здымных пласціначных пратэзаў залежыць ад велічыні пратэза, ступені фіксацыі яго на сківіцы і характару перадачы жавальнага ціску. Мае значэнне рэакцыя органаў і тканак рота дый усяго арганізма на зубны пратэз. Гэта залежыць у многім ад тыпу вышэйшай нервовай дзейнасці чалавека, узросту і агульнага стану здароўя.

Людзі нервовыя, нецярплівыя ўпадаюць у адчай і не хочуць карыстацца пратэзамі. Гэта няправільна. Неабходна пераадолець сябе і нават пры позывах на рвоту, не вымаць пратэз. Дапамагае пазбавіцца ад непрыемнага адчування глыбокае дыханне праз нос, смактанне ледзяшоў. Праз дзень-два-тры непрыемныя адчуванні павінны знікнуць. Трэба толькі імкнуцца не засяроджвацца на іх. Любое пераключэнне — работа, цікавая кніга, тэлеперадача — адцягвае думкі ад пратэза, і ён перастае ўспрымацца як іншароднае цела. У сярэднім, працэс адаптацыі да бюгельных пратэзаў цягнецца адзін тыдзень, а да пласціначных пры частковых дэфектах зубных радоў — месяц. Людзі з поўнай адсутнасцю ўласных зубоў асвойваюцца з пласціначнымі пратэзамі прыкладна за паўгода.

✓ Эфектыўнасць карыстання пратэзамі залежыць не толькі ад іх канструкцыі і якасці вырабу, але і ад жадання пацыента пераадолець цяжкасці і выканаць указанні ўрача.

✓ На наступны дзень пасля пачатку карыстання пратэзам неабходна падысці да стаматолага для агляду, нават пры адсутнасці болевых адчуванняў і нязручнасцяў. Справа ў тым, што ў некаторых людзей паніжана болевая адчувальнасць слізістай абалонкі, і яны не адчуваюць болю нават пры яе значнай траўме пад пратэзам.

✓ Калі пратэз прычыняе боль, зніміце яго, але абавязкова за 3-4 гадзіны да наведвання ўрача зноў надзеньце, інакш урач не зможа вызначыць лакалізацыю траўмы ад пратэза на слізістай абалонцы.

✓ Не спрабуйце самі выправіць пратэз, паколькі яго можна лёгка сапсаваць.

Пацыентаў заўсёды непакоіць, ці змогуць яны нармальна размаўляць пасля пратэзавання. Хутчэй аднавіць правільнае маўленне дапамагаюць моўныя практыкаванні — па 10-15 хвілін чатыры разы ў дзень, кажа Людміла Вячэрская. Вымаўляйце, напрыклад, такія рускія словы: «оса», «очи», «роза», «хорошо». Пачынайце з павольнага вымаўлення гэтых слоў шэптам з падкрэсленай артыкуляцыяй. Затым тэмп вымаўлення паскарайце і голас узмацняйце. Карыснае таксама чытанне ўслых ціхім голасам. Спачатку чытайце павольна, затым хутчэй і гучней. У большасці пацыентаў правільнае маўленне аднаўляецца даволі хутка — праз 5-6 дзён. Калі ж праз 2-3 тыдні карыстання зубнымі пратэзамі дыкцыя не паляпшаецца, неабходна звярнуцца да стаматолага-артапеда.

Цяжэй і больш павольна аднаўляецца функцыя жавання. Па першым часе чалавек адчувае нязручнасць, а часам — і боль пры жаванні. Таму спачатку не варта ўжываць сухую і цвёрдую ежу. Жуйце павольна, рэжце ежу на дробныя кавалкі. Для паскарэння працэсу адаптацыі, імкніцеся не знімаць пратэзы на працягу месяца ні днём, ні ноччу. Знімайце іх толькі для гігіенічнай апрацоўкі. Штодня раніцай і перад сном няздымныя зубныя пратэзы неабходна чысціць, як і ўласныя зубы, шчоткай з зубным парашком або пастай. Лепш зубным парашком, паколькі ён валодае добрымі ачышчальнымі вартасцямі.

Здымныя пратэзы неабходна мыць пасля кожнага прыёму ежы праточнай (але не гарачай) вадой і абавязкова апалоскваць рот. На пратэзах могуць заставацца астаткі ежы, утварацца налёт, а затым — і зубны камень. Астаткі ежы, калі разлагаюцца, шкодна дзейнічаюць на зубы, яны пачынаюць разбурацца, і асабліва часта гэта назіраецца каля кручкоў (кламераў).

У далейшым, пасля прывыкання да пратэзаў, іх на ноч варта знімаць, дасканала чысціць зубной шчоткай з зубным парашком, захоўваць у спецыяльнай пасудзіне з накрыўкай, якую можна набыць у аптэцы, або ў шклянцы з гатаванай вадой пакаёвай тэмпературы. Урач, які вырабіў пратэз, дае індывідуальную рэкамендацыю пацыенту аб тым, як карыстацца пратэзам у начны час: пакідаць у ротавай поласці або знімаць і захоўваць у пасудзіне з накрыўкай. Нельга класці пратэз у гарачую ці нават цёплую ваду, паколькі ён будзе дэфармавацца. Зараз лічыцца, што пакідаць пратэз на ноч без вады не варта: пластмаса хутка «старэе», становіцца крохкай. Ад моцнага чаю, чорнай кавы, курэння пратэзы могуць мяняць колер.

Пры з'яўленні трэшчын або іншай паломцы карыстацца пратэзам нельга, каб не траўмаваць мяккія тканкі. Неабходна звярнуцца да стаматолага.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

ДОКТАР АДКАЖА

## НІ ХЛЕБ УКУСІЦЬ, НІ СЛОВА СКАЗАЦЬ...

**«Прывыкаў да пратэзаў цэлую зіму, аднак есці так і не атрымалася. Варта толькі ўкусіць хлеб, як пратэз вывярочваецца, пры размове або кашлі — выпадае. У красавіку зноў паехаў да доктара ў Чэрвень. Хадзіў да загадчыцы, паказваў, што пратэз зроблены не насупраць дзясны, а па яе вонкавым баку. Яна зноў адправіла да доктара, той падагнуў скабу, уставіў пратэз — нібы трымаецца. Але ж пры размове зноў выпадае, не гаворачы аб тым, што есці па-ранейшаму нельга. Урач сказаў: «Купіце «Карэгу». Я купіў, зрабіў усё па інструкцыі. Паспрабаваў есці — зноў нязручна. Толькі адно суцішала: пакуль карыстаўся «Карэгай», можна было хоць бы размаўляць. Што мне рабіць?**

**Леанід Канстанцінавіч,** *Чэрвеньскі раён*».

**Намеснік галоўнага ўрача 4-й гарадской клінічнай стаматалагічнай паліклінікі г. Мінска Людміла ВЯЧЭРСКАЯ:**

— Зразумела, што без агляду ротавай поласці даць кансультацыю немагчыма. Мяркуючы па тым, што зафіксаваць пратэз не атрымліваецца нават з дапамогай геля «Карэга», не выключана, што пратэз сапраўды выраблены няякасна. Я раіла б вам звярнуцца да галоўнага ўрача паліклінікі. У выпадку, калі вам не могуць дапамагчы ў той установе, дзе вырабілі пратэз, вас павінны накіраваць на кансультацыю ў абласную стаматалагічную клініку або на кафедру артапедычнай стаматалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Спецыялісты кафедры кансультуюць па ўсёй рэспубліцы. Як з імі звязацца, падкажа галоўны ўрач.

## ПРАТЭЗАВАННЕ ПАТРАБУЕ ПАДРЫХТОЎКІ

**Поспех пратэзавання залежыць не толькі ад дасканаласці выканання ўрачэбных маніпуляцый і работы зубнога тэхніка, але і ад таго, наколькі правільна быў пастаўлены і выкананы план падрыхтоўкі пацыента. Можна прымяніць самыя сучасныя тэхнічныя прыёмы вырабу пратэзаў і самыя дасканалыя спосабы пратэзавання, але не атрымаць пажаданага выніку толькі таму, што папярэдняя падрыхтоўка была непаўнацэннай.**

Падрыхтоўка да пратэзавання пачынаецца з санацыі ротавай поласці, агульных аздараўленчых мерапрыемстваў, тлумачыць **урач-стаматолаг-тэрапеўт 8-й гарадской паліклінікі г. Мінска Надзея ХВЕДЧЫНА**. Апошнія з'яўляюцца абавязковай часткай любога плана падрыхтоўкі да пратэзавання. Сюды ўваходзіць зняцце зубных адкладанняў, лячэнне захворванняў слізістай, а таксама простага і ўскладненага карыесу (пульпіту і перыядантыту), выдаленне зубоў і каранёў, якія не падлягаюць пратэзаванню.

Праводзяцца і спецыяльныя падрыхтоўчыя мерапрыемствы. Так, напрыклад, пры замяшчэнні зубных радоў маставіднымі пратэзамі не ўзнікае пытання аб выдаленні рэзка выражаных косных выступаў, пластыцы уздзечак губ, у той час як пры пратэзаванні бяззубых сківіц здымнымі пратэзамі гэтыя аперацыі нярэдка становяцца неабходнымі. У адных выпадках спецмерапрыемствы па падрыхтоўцы да пратэзавання аблягчаюць сам працэс, у другіх — ствараюць умовы для лепшай фіксацыі. Спецыяльная падрыхтоўка ўключае шэраг тэрапеўтычных, хірургічных і артапедычных мерапрыемстваў, аб'ём і паслядоўнасць якіх у значнай ступені залежаць ад канструкцыі пратэза.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

■ Радар

# «ФІЛЬТРУЕМ» КІРОЎЦАЎ, ПРАДУХІЛЯЕМ ДТЗ

**Апошнім часам пачасціліся дарожна-транспартныя здарэнні з цяжкімі наступствамі. Сярод галоўных «герояў» — «вадзіцелі-бяспраўнікі», тыя, хто яшчэ не атрымліваў пасведчанне і тыя, каго ўжо пазбавілі права кіраваць аўто. Менавіта таму гэтымі днямі ДАІ нашай краіны, а менавіта спецпадраздзяленне «Страла», у наваколлі беларускай сталіцы правяла спецыяльную акцыю «Фільтр». Падчас яе кантраляваліся месцы масавага адпачынку каля рэк Пціч і Вяча, а таксама Мінскага мора.**

Карэспандэнту «Звязды» ўдалося прысутнічаць на сапраўднай аперацыі дарожных вартавых і ўбачыць усё на свае вочы. Паміж спыненнямі аўтамабіляў мы пагутарылі са **старшым інспектарам упраўлення ДАІ МУС Аляксандрам БРУЕМ**.

**— Зараз многія кіроўцы пакутуюць ад спякоты. Як раіце ратавацца ад яе?**

— Найперш, па магчымасці, трэба абмежаваць выезды, а лепш нават адмовіцца ад аўтамабіля. Калі ўсё ж такі прыйшлося сесці за руль, гэта лепш рабіць раніцай ці ўжо ўвечары, калі сонца не так паліць. Па-другое, трэба заўсёды браць з сабой бутэльку з вадой. Тэхніка гарачыні не вытрымлівае, а чалавек тым больш. Не варта забываць пра аптэчку, дзе павінен быць неабходны набор медыкаментаў. Таксама трэба часцей спыняцца, праветрываць машыну. Калі вы едзеце з дзецьмі, ні ў якім выпадку не пакідайце іх адных у машыне!

**— Як ставіцеся да таго, што вадзіцелі часта папярэджваюць адзін аднаго міганнем фар аб прысутнасці на дарозе супрацоўнікаў ДАІ? Цікава, што нават у твітары пачалі ў анлайнавым рэжыме пісаць, дзе і хто стаіць.**

— Толькі станоўча. Я нават сам, калі езджу за рулём свайго аўтамабіля і бачу, што стаяць супрацоўнікі ДАІ, з задавальненнем папярэджваю сустрэчныя машыны. Бывае, міргаю фарамі, калі і не стаяць — для таго, каб людзі проста зменшылі хуткасць. Гэта як прафілактыка. Бо задача — не аштрафаваць, а найперш прадухіліць ДТЗ.

Адна з галоўных задач аперацыі «Фільтр» — прадухіленне няшчасных выпадкаў. Быў перакрыты ўчастак дарогі, на якім правяралі і спынялі толькі тых кіроўцаў, якія раней мелі такія парушэнні, як адсутнасць дакументаў і ваджэнне ў нецвярозым стане. З 6 вечара і да гадзіны ночы быў спынены 21 вадзіцель, пазбаўлены права кіраваць транспартным сродкам, і 1 кіроўца «падшафэ». Убачыць сваіх патэнцыйных парушальнікаў супрацоўнікам ДАІ дапамагло спецыяльнае абсталяванне «Аўтаўраган», якое выставілі літаральна за паўкіламетра да самога паста. З яго дапамогай фатаграфуюцца нумары кожнай машыны, што праязджае, і кожны ўладальнік транспартнага сродку аўтаматычна правяраецца па базе.

**Надзея БУЖАН,**
**фота аўтара**



**Извещение об открытом аукционе по продаже земельного участка гражданам для строительства и обслуживания жилых домов**

Организатор аукциона — Новомышский сельский исполнительный комитет Барановичского района Брестской области

| № п/п | Месторасположение земельного участка, адрес, кадастровый номер участка | Характеристика | Площадь земельного участка, га | Назначение участка | Начальная цена земельного участка, рублей | Сумма задатка, рублей | Затраты на организацию и проведение аукциона, рублей |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Республика Беларусь, Брестская область, Барановичский район, Новомышский с/с, д. Звездная, ул. Полевая, 12, кадастровый номер 120486002601000610 | Участок свободен от застройки. Подъезд к земельному участку предусматривается по существующей уличной сети | 0,15 га | для строительства и обслуживания жилого дома | 19 486 800= | 1946880= | Стоимость за проектно-изыскательские работы по формированию участка 1 242 349 руб.; государственную регистрацию 321 405 руб.; информационных сообщений в средствах массовой информации газетах «Наш край», «Звязда», официальном сайте Государственного комитета по имуществу РБ |
| 2 | Республика Беларусь, Брестская область, Барановичский район, Новомышский с/с, д. Звездная, ул. Полевая, 14, кадастровый номер 120486002601000611 | Участок свободен от застройки. Подъезд к земельному участку предусматривается по существующей уличной сети | 0,15 га | для строительства и обслуживания жилого дома | 19 486 800= | 1946880= | Стоимость за проектно-изыскательские работы по формированию участка 1 242 349 руб.; государственную регистрацию 321 405 руб.; информационных сообщений в средствах массовой информации газетах «Наш край», «Звязда», официальном сайте Государственного комитета по имуществу РБ |
| 3 | Республика Беларусь, Брестская область, Барановичский район, Новомышский с/с, д. Звездная, ул. Полевая, 16, кадастровый номер 120486002601000612 | Участок свободен от застройки. Подъезд к земельному участку предусматривается по существующей уличной сети | 0,15 га | для строительства и обслуживания жилого дома | 19 486 800= | 1946880= | Стоимость за проектно-изыскательские работы по формированию участка 1 242 349 руб.; государственную регистрацию 321 405 руб.; информационных сообщений в средствах массовой информации газетах «Наш край», «Звязда», официальном сайте Государственного комитета по имуществу РБ |
| 4 | Республика Беларусь, Брестская область, Барановичский район, Новомышский с/с, д. Звездная, ул. Полевая, 18, кадастровый номер 120486002601000613 | Участок свободен от застройки. Подъезд к земельному участку предусматривается по существующей уличной сети | 0,15 га | для строительства и обслуживания жилого дома | 19 486 800= | 1946880= | Стоимость за проектно-изыскательские работы по формированию участка 1 242 349 руб.; государственную регистрацию 321 405 руб.; информационных сообщений в средствах массовой информации газетах «Наш край», «Звязда», официальном сайте Государственного комитета по имуществу РБ |

1. Аукцион состоится **17 августа 2012 года в 15.00** в здании Новомышского сельисполкома по адресу: Республика Беларусь, Брестская обл., Барановичский район, д. Новая Мышь, ул. Парковая, 6.

2. Условия аукциона:

- к участию в аукционе допускаются граждане, подавшие заявления в соответствии с действующим законодательством.

3. Продажа земельного участка производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории РБ или приравненным к постоянно проживающим, в соответствии с законодательством.

4. Шаг аукциона к начальной цене земельного участка — 5%.

5. Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении, представить в комиссию по проведению аукциона заявление, к заявлению прилагают:

- заверенную банком копию платежного поручения (квитанцию) о внесении задатка;

- копию документа, удостоверяющего личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица;

- доверенность, заверенную нотариально, если в аукционе участвует представитель физ. лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

6. Сумма задатка перечисляется до 14 августа 2012 г. до 15.00 на р/счет 3600211140009, в ф-л 802 ОАО «АСБ Беларусбанк», код платежа 4901, УНП 200047005.

Адрес банка: г. Барановичи, Б. Штоккерау, 8А.

Получатель: Новомышский сельский Совет депутатов, 225331 Брестская обл., Барановичский р-н, д. Новая Мышь, ул. Парковая, 6.

Победитель аукциона — участник, предложивший наибольшую цену.

Результаты аукциона утверждаются решением комиссии по проведению аукциона.

В случае наличия одной заявки предмет аукциона может быть продан по начальной цене с учетом шага аукциона по решению комиссии.

7. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи каждый четверг недели после опубликования настоящего извещения в СМИ по предварительной записи в комиссии по телефону (8 0163) 43 12 36.

8. Продажа земельного участка производится без изменения его целевого назначения.

9. Заявления на участие в аукционе принимаются после размещения извещения о проведении аукциона в СМИ в рабочие дни с 8.00 до 17.00 в Новомышском сельисполкоме. Последний день приема документов **14 августа 2012 г. до 15.00.**

10. Заключительная регистрация участников аукциона **17 августа 2012 г. с 14.00 до 15.00.**

К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

11. Победитель аукциона обязан подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; не позднее 10 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка возместить расходы по формированию и регистрации зем. участка и затраты на подготовку и проведение аукциона (в том числе затраты, связанные с размещением извещений о проведении аукциона в средствах массовой информации); внести плату за земельный участок. Не позднее 2-х месяцев после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка произвести регистрацию права частной собственности на земельный участок.

г. ВИТЕБСК 27.08.2012

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ

| № лота | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Неиспользуемое почтовое отделение связи, расположенное по адресу: Витебская область, Витебский район, Новкинский с/с, д. Комары, ул. Придорожная, д. 3 | Характеристика объектов недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 200/С-47250 (здание специализированное связи) одноэтажное бревенчатое, облицованное кирпичом, фундамент – бетонный ленточный, перекрытия – дощатые, крыша шиферная, общей площадью 33,5 кв.м, 1957 года постройки с холодной пристройкой, сараем, уборной. Земельный участок: с кадастровым номером 221287008601000023, площадью 0,0284 га, для обслуживания отделения почтовой связи, сроком аренды 50 лет. | 23142564 | 4628500 |
| 2 | Неиспользуемое почтовое отделение, расположенное по адресу: Витебская область, Лиозненский район, Крынковский с/с, д. Мерзляково, ул. Центральная, д. 3А | Характеристика объектов недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 202/С-54751 (здание иного назначения) одноэтажное кирпичное, фундамент – бетонный, перекрытия – деревянные, крыша шиферная, общей площадью 70 кв.м, 1961 года постройки с сараем, уборной. Земельный участок: с кадастровым номером 223083011101000004, площадью 0,0427 га, для содержания и обслуживания здания отделения связи, сроком аренды 25 лет. | 38953758 | 7790750 |
| 47. | Ул. Руссиянова, 11, три смежных помещения №№ 49, 50, 52 на втором этаже, имеется естественное освещение, в здании имеется энергоснабжение, отопление, водоснабжение, канализация. Под административное использование – офис, производственное, бытовое использование. | 67,9 | 6 790 |
| | **ГП «ОМЗ Белбыта», тел. 262-00-08, 262-10-21** | | |
| 48. | Ул. Лукьяновича, 10, помещение в гаражном боксе № 7, отсутствуют коммуникации. Под склад. | 15,0 | 1 500 |
| | **ЖКК ОАО «Стройтрест № 4», тел. 280-26-96** | | |
| 49. | Пер. Калининградский, 17а, помещение на первом этаже административного здания, имеется естественное освещение, отопление, энергоснабжение. Под административное спользование – офис. | 13,4 | 1 340 |
| 50. | Пер. Калининградский, 17а, помещение на первом этаже административного здания, имеется естественное освещение, отопление, энергоснабжение. Под административное использование – офис. | 7,5 | 750 |
| | **ГП «Горавтомост», тел. 226-49-46** | | |
| 51. | Подземный пешеходный переход по пр. Независимости – ул. Козлова, отсутствует естественное освещение, отопление. Под торговый объект продовольственной группы товаров. | 11,7 | 1 170 |
| | **КУП «УДМС и Б Мингорисполкома», тел. 203-13-73** | | |
| 52. | Ул. Судмалиса, 22, помещение из трех комнат на первом этаже административного здания, имеется естественное освещение, отопление, водоснабжение. Вход в помещение через смежную комнату. Под административное использование – офис. | 48,07 | 4 810 |
| | **КУП «УДМС и Б Мингорисполкома», тел. 211-01-16** | | |
| 53. | Ул. Короля, 9, помещение № 130 на первом этаже общежития, имеется отопление, энергоснабжение. Для оказания услуг населению и проживающим в общежитии (кроме ремонта обуви, бытовых услуг, услуг, требующих водоснабжения и образовательную деятельность). | 13,38 | 1 340 |
| | **АКУП «Спецкоммунавтотранс», тел. 249-55-62, 249-62-70, 247-90-80** | | |
| 54. | Ул. Ванеева, 46, здание специализированного назначения (контрольно-пропускной пункт). Под административное использование – офис. | 16,1 | 1 610 |
| | **УП «Зеленстрой Центрального района г. Минска», тел. 293-18-97** | | |
| 55. | Комсомольское озеро (парк Победы), площадка для размещения объекта, функционирующего в весеннее-осенний период – летнее кафе с правом реализации пива. Имеется мелкоплиточное покрытие, электрический щит. | 60,0 | 6 000 |
| 56. | Комсомольское озеро (парк Победы), специфическая площадка для размещения пункта проката электросамокатов «Segway» на территории парка Победы на весенне-осенний период. | 5,0 | 500 |
| | **КДУП «Городские парки Минскзеленстроя», тел. 281-65-46** | | |
| 57. | Ул. Фрунзе, 2, центральный детский парк им. Горького. Открытая площадка с покрытием для размещения аттракциона «Сальто». | 63,0 | 6 300 |
| 58. | Ул. Долгобродская, 44, парк культуры и отдыха им. 50-летия Октября. Открытая площадка с покрытием для размещения вендингового автомата, при условии подведения водоснабжения и энергоснабжения за счет средств арендатора. | 5,0 | 500 |
| 59. | Ул. Долгобродская, 44, парк культуры и отдыха им. 50-летия Октября. Открытая площадка с покрытием для размещения вендингового автомата, при условии подведения водоснабжения и энергоснабжения за счет средств арендатора. | 5,0 | 500 |
| | **КПУП «Минскреклама», тел. 294-03-85** | | |
| 60. | Ул. Захарова, 76, помещение на третьем этаже административно-производственного корпуса, имеется естественное освещение, отопление, энергоснабжение, санузел совместного пользования. Под административное использование – офис. | 53,1 | 5 310 |
| 61. | Ул. Захарова, 76, помещение на втором этаже здания гаража, имеется естественное освещение, отсутствует отопление, энергоснабжение, водоснабжение, требуется ремонт кровли, помещения, замена электрооборудования. Под производственное, административное использование. | 46,06 | 4 610 |

**Организатор аукциона – УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39.**

Аукцион состоится **30 июля 2012 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Документы на участие принимаются **с 16 июля по 26 июля 2012 г.** в рабочее время (перерыв на обед с 13.00 до 14.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Документы, поданные после указанного времени, не рассматриваются. Срок договора аренды 5 лет.**

Для осмотра объектов недвижимости, право заключения договоров аренды которых выставлено на аукцион, необходимо в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, в рабочее время обращаться к арендодателям по телефонам, указанным в настоящем извещении. Организатор аукциона рекомендует участникам аукциона при осмотре объекта недвижимости уточнить у арендодателя возможность использования объекта под планируемые виды деятельности (в том числе с учетом требований по санитарным и противопожарным нормам), а также соответствующий планируемому виду деятельности размер арендной платы.

Аукцион проводится в порядке, предусмотренном Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в коммунальной собственности г.Минска, утвержденной решением Мингорсовета от 23.09.2009 № 250.

Для участия в торгах лицо, желающее участвовать в торгах, в течение срока, установленного для приема документов для участия в аукционе, подает заявление на участие в торгах по установленной форме (бланки заявлений – у организатора аукциона) со следующими документами:

заявление об ознакомлении с объектом недвижимости, право заключения договора аренды которого выставлено на торги, по установленной форме (бланки заявлений – у организатора аукциона);

заверенная копия платежного поручения о внесении задатка (без НДС) участником аукциона в размере 10 процентов от начальной цены предмета аукциона (назначение платежа – задаток для участия в аукционе) на расчетный счет № 3012104971019 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, пр. Машерова, 80, код 153001369, УНП 190398583 УП «Минский городской центр недвижимости». **Задаток должен быть внесен до 17.30 26.07.2012;**

гражданином Республики Беларусь – копия документа, удостоверяющего личность, без нотариального засвидетельствования (паспорт, страницы 31, 33 и страница с регистрацией места жительства (пропиской));

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

юридическим лицом Республики Беларусь – доверенность, выданная представителю юридического лица (за исключением случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования (**копии свидетельства о государственной регистрации и устава, при необходимости копию контракта с руководителем**), документ с указанием банковских реквизитов юридического лица (**информационное письмо**), **документ о назначении руководителя**;

иностранным гражданином – копия документа, удостоверяющего личность, с переводом на белорусский или русский язык (подпись переводчика нотариально удостоверяется), документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной небанковской кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность;

представителем иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной небанковской кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

**При подаче документов** на участие в торгах граждане, индивидуальные предприниматели, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, руководители юридических лиц **предъявляют документ**, удостоверяющий личность (паспорт).

При отсутствии у граждан, индивидуальных предпринимателей текущего (расчетного) счета, он должен быть открыт в учреждении банка до подачи заявления на участие в торгах и указан в соответствующем заявлении.

Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представляемых для участия в торгах, несут лица, желающие участвовать в торгах.

К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, соответствующее заявление с приложением необходимых документов, внесшие в установленном порядке задаток и заключившие соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения торгов по установленной форме (бланки соглашений – у организатора аукциона, заполняется в двух экземплярах).

Оплата за право заключения договора аренды осуществляется победителем аукциона разовым платежом в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан возместить УП «Минский городской центр недвижимости» затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом торгов под роспись.

В соответствии с Инструкцией о порядке сдачи в аренду капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, их частей, находящихся в коммунальной собственности г. Минска, утвержденной решением Мингорсовета от 16.12.2009 № 271, договор аренды недвижимого имущества с победителем аукциона заключается на основании решения Мингорисполкома о сдаче в аренду этого имущества на пять лет в срок в соответствии с законодательством.

По объектам недвижимого имущества, право заключения договора аренды которых продано на аукционе, арендодатель оформляет в комиссию Мингорисполкома по упорядочению использования зданий, сооружений и помещений, находящихся в государственной собственности, заявление о согласовании сдачи недвижимого имущества в аренду и условия договора аренды. Заявление должно быть подписано арендодателем и победителем аукциона, а по объектам, находящимся в хозяйственном ведении ЖРЭО администраций районов г. Минска, согласовано с администрацией района г. Минска, на территории которого расположено недвижимое имущество.

По объектам недвижимого имущества, право заключения договора аренды которых продано на аукционе, арендодатель вправе до получения соответствующего решения Мингорисполкома заключить с Победителем аукциона договор аренды в соответствии с законодательством на срок до 2 месяцев.

**Телефон для справок (017) 327 40 22. Интернет: www.mgcn.by.**

---

**ОАО «Минскгрузавтотранс» извещает своих акционеров**
**о проведении 27 июля 2012 года**
**внеочередного общего собрания акционеров.**

**Повестка дня:**

1. О совершении ОАО «Минскгрузавтотранс» взаимосвязанных сделок, образующих крупную сделку хозяйственного Общества.
2. О передаче Наблюдательному совету ОАО «Минскгрузавтотранс» полномочий по внесению изменений в условия взаимосвязанных сделок, образующих крупную сделку хозяйственного Общества.
3. О внесении изменений и дополнений в Устав ОАО «Минскгрузавтотранс».

**Собрание состоится по адресу: г. Минск, ул. Минина, 21, корп. 2.**
**Начало собрания в 10.00.**

С материалами, подготовленными к собранию, акционеры могут ознакомиться по месту нахождения Общества (г. Минск, ул. Минина, 21, корп. 2, комн. 11) в рабочие дни в период с 18 по 26 июля 2012 года с 08.00 до 13.00, а в день проведения собрания – в помещении, где оно проводится с 08.15 до 09.00.

Регистрация участников собрания будет проводиться с 09.00 до 09.45 в день и по месту проведения собрания – по предъявлению документа, удостоверяющего личность, а представителей акционеров – и доверенности.

Список акционеров Общества, имеющих право на участие в собрании, составлен на основании данных реестра акционеров по состоянию на 16 июля 2012 года.

**Справки по тел. (8 017) 222 98 24.**

*УНП 100028545* **Наблюдательный совет ОАО «Минскгрузавтотранс».**

---

**К сведению акционеров**
**ОАО «Современные розничные технологии»!**

Открытое акционерное общество «Современные розничные технологии» объявляет о проведении закрытой подписки на дополнительные простые (обыкновенные) акции.

Решение о проведении закрытой подписки на дополнительные простые (обыкновенные) акции утверждено общим собранием акционеров ОАО «Современные розничные технологии» (Протокол № 5 от 16.07.2012).

**Условия проведения закрытой подписки:**

1. Размер объявленного уставного фонда Общества: 25 738 212 698 (двадцать пять миллиардов семьсот тридцать восемь миллионов двести двенадцать тысяч шестьсот девяносто восемь) белорусских рублей.

2. Планируемый объем дополнительной эмиссии:

сумма дополнительной эмиссии – 20 000 004 200 (двадцать миллиардов четыре тысячи двести) белорусских рублей;

количество дополнительных простых (обыкновенных) акций – 556 700 (пятьсот пятьдесят шесть тысяч семьсот) штук;

номинальная стоимость одной акции: 35 926 (тридцать пять тысяч девятьсот двадцать шесть) белорусских рублей;

цена подписки: 35 926 (тридцать пять тысяч девятьсот двадцать шесть) белорусских рублей за одну акцию.

Выпуск акций будет осуществляться в виде записей на счетах.

Место, время, срок и порядок проведения закрытой подписки на акции: место: ул. Мирошниченко, 3, к. 20, 220131, г. Минск, Республика Беларусь,

время: с 09 часов 00 минут до 17 часов 00 минут;

период и порядок проведения закрытой подписки на дополнительные акции:

дата начала подписки: 17.07.2012;

дата окончания подписки: 19.07.2012;

дата начала и окончания периода сбора предложений (заявок): предложения (заявки) акционеров, намеревающихся приобрести дополнительно выпускаемые акции, принимаются в течение 17.07.2012;

акционер, подавший предложение (заявку) на участие в подписке на акции, вправе в период проведения закрытой подписки заключить договор, внести денежные средства;

закрытая подписка на дополнительные акции возможна после государственной регистрации изменения номинальной стоимости акций и увеличения уставного фонда Общества.

Оплата акций осуществляется денежными средствами.

Денежные средства в счет оплаты акций, согласно заключенным договорам подписки, перечисляются на р/с ОАО «Современные розничные технологии»: р/с 3012220760018 в филиале ОАО «Белагропромбанк» Минская городская дирекция, код 963, или специальный счет, указываемый в договоре подписки.

3. Сбор заявок от лиц, намеревающихся приобрести дополнительно выпускаемые акции, прекращается досрочно после подачи заявки(ок) на всю сумму (объем) дополнительной эмиссии.

При наличии заявок от нескольких лиц, намеревающихся приобрести весь пакет дополнительно выпускаемых акций, договор подписки заключается с лицом, первым подавшим заявку на участие в закрытой подписке на акции.

Досрочное прекращение проведения подписки происходит в случае перечисления Обществу всей сумы денежных средств, дополнительной эмиссии.

4. Превышение планируемого объема эмиссии не допускается.

В случае недостижения планируемого объема эмиссии, общее собрание акционеров вправе принять одно из решений:

утвердить результаты подписки и объявить подписку состоявшейся в сумме фактического взноса;

принять решение о продлении срока подписки на акции дополнительного выпуска.

5. Условия отказа от заключения договора подписки: нарушение условий подписки, досрочное окончание подписки.

6. Подписка на акции может быть признана несостоявшейся при отсутствии заключенных договоров подписки на дату окончания подписки.

7. Условия и порядок возврата средств инвесторам при признании подписки на акции не состоявшейся, либо при запрещении выпуска акций регистрирующим органом, либо при реализации акционером права на отказ от заключения (исполнения) договора: денежные средства, зачисленные на расчетный счет Общества, возвращаются лицам, их перечислившим, в течение 30 календарных дней со дня принятия такого решения.

8. Порядок расчета и выплаты дивидендов по акциям определяется Уставом Общества, а также решением годового общего собрания акционеров Общества.

9. Общество гарантирует сохранность средств, собранных в ходе подписки на акции, до государственной регистрации выпуска дополнительных акций ОАО «Современные розничные технологии».

10. Цели эмиссии и направления использования средств, полученных в результате проведения подписки на акции: пополнение оборотных средств Общества, расчеты с Поставщиками, реконструкция магазинов, оптимизация бизнес-процессов, развитие Общества.

11. Преимущественным правом на покупку акций дополнительного выпуска никто из акционеров Общества не обладает.

12. Иные существенные условия подписки определяются договором подписки на простые (обыкновенные) акции в соответствии с требованиями законодательства о рынке ценных бумаг.

13. Подробную информацию можно также получить в рабочие дни с 09.00 до 17.00 по телефону 017 261 00 89.

*УНП 690019195* **Наблюдательный совет.**

# РЫБАК БЕЛАРУСІ

**26-гадовы беларускі нарвежац Аляксандр Рыбак патрапіў у Farytale, прымусіў беларусаў спяваць хорам і прыцэньваўся да мясцовых лецішчаў.**



Фота БЕЛТА.

Ён практычна мой равеснік. Вельмі мілы, з вачыма нейкага кінагенічнага аленяняці. Трохі інфантыльны, трохі экзальтаваны. Карацей, святая прастата. Нешта з гэтага, відаць, пройдзе з узростам. Беларусы дазваляюць усё, таму што адчуваюць да гэтага хлопца нейкую генетычную мегалюбоў. Ён вельмі любіць Беларусь. Для яго гэта краіна-казка з блакітнымі азёрамі і вялікімі зубрамі з самотнымі глыбокімі вачыма. Бадай як у песні.

Ён сябруе з Філіпам Кіркоравым, марыць паехаць адпачываць у Лос-Анджэлес з найлепшым сябрам і на сваёй прэс-канферэнцыі ў рамках «Славянскага базару ў Віцебску» прымусіў цэлую залу сказаць хорам па-англійску «Здароў, Еўропа! Запрашаем у Беларусь!». А сам запісаў гэта на відэа. Відавочна, не без пэўнага разліку. Уключыць гэта ў новы кліп, не сумнявайцеся.

Вось падборка красамоўных выказванняў маладога «класічнага кампазітара», як ён сам сябе называе, пра сваю малую радзіму Беларусь, беларускіх сваякоў і песні на беларускай мове.

— У мяне пляменіцца Ульяна жыве тут, у Віцебску. Я плануюе наведаць. Як і маю старэйшую сястру Юлю, маці Ульяны. Малой тры тыдні таму споўнілася 6 гадоў. Пакуль што я бачыў яе толькі два разы ў жыцці. І другі раз акурат на яе дзень нараджэння. Я падарыў ёй квіток у парк атракцыёнаў. Яна была вельмі шчаслівая.

— Часам у мяне ёсць праблемы з кантактаваннем з людзьмі ў Нарвегіі. Мне здаецца, што, магчыма, гэта нейкая беларуская ментальнасць ува мне прачынаецца. Мне заўжды хочацца, каб усё было ідэальна. Не люблю, калі людзі абяцаюць зрабіць нешта і не робяць. Магчыма, мне ўласцівыя і большая сканцэнтраванасць і працавітасць, чым карэнным нарвежцам.

— Жыць у Беларусі я не планую. Але вельмі хацеў бы набыць тут лецішча і прыязджаць на адпачынак. Наведваць сваіх бабуль, пляменшак, сястру. Мне заўжды вельмі пазітыўна думаецца, калі я ў Беларусі. Можа быць, ад таго, што я рэдка тут бываю. І свежасць успрымання захоўваецца.

— У Еўропе музыканту дастаткова выйсці на сцэну ў звычайнай кашулі з гітарай, і ўсе будуць любіць яго. Тут хочуць, каб я загрыміраваўся, надзеў нейкі вар'яцкі касцюм. Карацей, зрабіў шоу. Там хочуць, каб стасункі паміж артыстам і слухачамі былі братэрскія. Тут у гэтым сэнсе таксама ўсё па-іншаму: хочуць, каб былі «зорка» і паклоннік. Чамусьці патрэбная пэўная адлегласць.

— Я пакуль што яшчэ не размаўляю па-беларуску. Але ў свой новы дыск уключыў адну песню на беларускай мове — «Небасхіл Еўропы». Мне вельмі падабаецца спяваць па-беларуску. Магчыма, некалі я змагу зрабіць асобны цалкам беларускі праект.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

# З НАДЗЕЯЙ НА ЛОНДАН

**Мінскі этап Кубка свету па мастацкай гімнастыцы адметны не толькі цудоўнай арганізацыяй, але і добрым вынікам айчынных грацый: падапечныя Ірыны Ляпарскай 9 разоў узыходзілі на п'едэстал пераможцаў у Палацы спорту!**

На апошняй прэс-канферэнцыі людзей сабралася столькі, што не было дзе праціснуцца. 16-гадовая расіянка Аляксандра Мяркулава, якую яшчэ ў раннім дзяцінстве пачалі параўноўваць з Алінай Кабаевай, сядзела ў «прэзідыуме», ззяла ўсмешкай і перагаворвалася з сяброўкамі. Таленавітая Саша ў чарговы раз узяла «серабро» этапа Кубка свету ў практыкаванні з булавамі, але была вельмі ўсцешаная, прасіла, каб сфатаграфавалі на памяць, і адказвала на жартачкі расійскіх калег-гімнастак. Так, заключны этап Кубка свету парадаваў жыхароў сталіцы цудоўным мастацкім шоу і пазнаёміў нас з тымі, хто ўжо ў бліжэйшай будучыні, магчыма, будзе задаваць тон у сусветнай гімнастыцы.



У практыкаванні з булавамі Любоў Чаркашына і Меліціна Станюта падзялілі трэці радок.

Вядомых асоб на спаборніцтвах сапраўды хапала. Пагаворваюць, што галоўны трэнер зборнай Расіі Ірына Вінэр наогул у Мінск прыляцела на прыватным самалёце. Дарэчы, пасля турніру Ірыну Аляксандраўну ўжо не бачылі: тая паспяшалася ў аэрапорт. Каманду Украіны таксама трэніруе заслужаны чалавек — Ірына Дзяругіна, двухразовая чэмпіёнка свету і, між іншым, былая жонка славутага футбаліста Алега Блахіна. На трыбуне — таксама россып талентаў. Вось па прыступках спрытна бяжыць Анатоль Буяльскі, былы трэнер жаночай зборнай Беларусі па баскетболе, а ў фае Палаца спорту наш карэспандэнт нос у нос сутыкнуўся з Аляксеем Грышыным, чэмпіёнам Алімпіяды ў Ванкуверы па фрыстайле.

— Якім ветрам мяне сюды прынесла? Мая жонка (**Святлана Рудалава** — **Аўт**.) былая гімнастка. Таму я і не першы год прыходжу на падобныя спаборніцтвы «пахварэць» за нашых, — кажа Грышын. — І мяне ніхто не прымушае гэта рабіць. Мне самому цікавы гэты від спорту. У нас моцныя дзяўчаты, і трэба падтрымаць іх.

Прыйшоў у Палац спорту разам з жонкай, таксама гімнасткай Валерыяй Курыльскай, хакеіст «Дынама» Андрэй Стась.

— Гэта, напэўна, самы прыгожы від спорту ў дзяўчат, — разважае Стась. — Мы з камандай у час Алімпіяды вылятаем на зборы ў Швейцарыю, але, па магчымасці, я з задавальненнем пагляджу алімпійскі турнір па мастацкай гімнастыцы.

Завалодаць беларусам хоць адным першым месцам на хатнім этапе не атрымалася. Усё золата старту заслужана заваявалі расійскія «мастачкі». А Яўгенія Канаева перамагла ў чатырох практыкаваннях. Мінскія спаборніцтвы — генеральная рэпетыцыя перад чаканай Алімпіядай, якая сабрала найлепшыя сілы сучаснай гімнастыкі. Таму ўдвая прыемна, што на фоне лепшых беларускія дзяўчаты выглядалі таксама выдатна. Мяркуйце самі. У групавых практыкаваннях зборная Беларусі (Марына Ганчарова, Настасся Іванькова, Наталля Лешчык, Ксенія Санковіч, Аліна Туміловіч, Аляксандра Наркевіч) тройчы была другой. А ў індывідуальных выступленнях Любоў Чаркашына і Меліціна Станюта на дваіх 6 разоў падымаліся на «бронзавую» прыступку.

— Гэта быў неблагі прагляд падрыхтоўкі да Алімпійскіх гульняў, — прызналася Марыя Шышкоўская, прэзідэнт тэхнічнага камітэта Міжнароднай федэрацыі гімнастыкі. — Безумоўна, трэба яшчэ папрацаваць дзяўчатам над выкананнем, але на выступленні паўплывала нервовасць. Вынікі, якія прадэманстравалі гімнасткі ў Мінску, вельмі важныя. Я ўпэўнена, што на Алімпіядзе будзе цікавая барацьба.

— Я задаволена вынікамі, і ў нас ёсць яшчэ час, каб бліскуча падрыхтавацца, — коратка падсумавала Ірына Ляпарская, галоўны трэнер зборнай Беларусі па мастацкай гімнастыцы.

Адметнасць падобных спаборніцтваў яшчэ і ў тым, што беларускі балельшчык на свае вочы можа пабачыць гатоўнасць айчынных грацый да Алімпіяды. Згадзіцеся, летам не так часта можна наведаць буйныя спартыўныя форумы і ацаніць годнасць спартсменак. «Мне вельмі важна, каб нашы гледачы ўбачылі наколькі мы падрыхтаваныя, — развівае думку гімнастка Любоў Чаркашына. — У іх не атрымліваецца ездзіць за намі на спаборніцтвы. І хочацца парадаваць хоць бы дома, каб шукалі магчымасць і ездзілі за намі. Глядацкая падтрымка часам творыць цуды».

Адзін з галоўных натхняльнікаў спаборніцтваў, Ірына Ляпарская атрымала апошнімі днямі шмат кампліментаў. І гэта менавіта той выпадак, калі казаць пра традыцыйныя рэверансы нельга. Турнір падрыхтавалі выдатна, густоўна, а нашых гімнастак — з добрай перспектывай на Алімпійскія гульні. Будзем у гэта верыць.

**Тарас ШЧЫРЫ.**
**Фота Надзеі БУЖАН.**



Яўгеніі Канаевай у чарговы раз не было роўных.

## Крымінал

### Пад касу — тры гектары канопляў

За паўтара месяца на Гомельшчыне знішчана каля 11 га незаконных пасеваў канопляў і маку — гэта амаль 20 тон наркатычных раслін. З іх чацвёртая частка — побач з вёскай Заполле ў Рагачоўскім раёне. Буйная плантацыя канопляў (больш за 3 гектары) выяўлена супрацоўнікамі групы па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі Рагачоўскага РАУС падчас мерапрыемстваў спецыяльнай праграмы «Мак». Пасевы скошаны і спалены. Дарэчы, напярэдадні на прысядзібным участку жыхаркі вёскі Стрэнькі ў тым жа раёне выяўлена больш за сто кустоў маку. У дачыненні да гаспадыні ўчастка складзены адміністрацыйны пратакол.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

### Адабрала ў бабулі... шампанскае

81-гадовая жыхарка Віцебска паскардзілася ў міліцыю на тое, што сярод белага дня невядомая ёй жанчына зайшла ў яе незачынены дом і ўкрала шампанскае і лікёр — па бутэльцы кожнага напітку. Супрацоўнікі Чыгуначнага РАУС затрымалі злачынку. Высветлілася, што ўкрала спіртное непрацуючая, раней судзімая за махлярства 32-гадовая мясцовая жыхарка.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### Па мільёну за кожны кілаграм

Паблізу вадаёма «Ленчына» ва Уздзенскім раёне работнікі Стаўбцоўскай міжрайінспекцыі затрымалі 43-гадовага грамадзяніна, які здабываў рыбу стаўнымі сеткамі. У парушальніка канфіскавалі дзве сеткі агульнай даўжынёй 100 метраў і ўлоў — 37 залатых карасёў і 18 ліней. Заважыў ён на 10 кілаграмаў. Шкода, нанесеная навакольнаму асяроддзю ў асабліва буйным памеры, ацэнена ў 11 мільёнаў рублёў. Выходзіць, кожны кілаграм рыбкі каштаваў браканьеру больш чым у мільён рублёў. Грамадзяніна чакае крымінальная адказнасць.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

## ШАШКІ

**Пад рэдакцыяй міжнароднага арбітра Мікалая ГРУШЭЎСКАГА.**

**ПАГОДА Ў ДОМЕ**



Канстанцін Міхайлавіч Барэль, што на здымку, узначальвае службу, якая імкнецца, каб у Свіслацкім раёне была добрая пагода ў кожным доме. Афіцыйна — ЖКГ РУП. Вось ужо ў дзявяты раз звяздоўскія рашальнікі пазіцый на 64-клетачных дошках будуць спаборнічаць на прызы працавітага калектыву, што невыпадкова, бо на прадпрыемстве жыллёва-камунальнай гаспадаркі старадаўняя гульня ў пашане. А сам дырэктар стаў двойчы чэмпіёнам Беларусі па завочных шашках — па класічнай версіі і ў турніры з лёсаваннем дэбютаў. Міністэрства спорту і турызму прысвоіла яму ганаровае званне нацыянальнага майстра па гэтым інтэлектуальным відзе спорту.

Конкурс мы так і назвалі «Пагода ў доме». Будуць адзначаны яго пераможцы, суддзя, каардынатар і лепшая рашальніца. У ім устаноўлена норма першага спартыўнага разраду.

Усяго будзе 24 заданні, падрыхтаваныя вядучым рубрыкі са сваёй практыкі, кожнае ацэньваецца ў адно ачко. Падаём першае з іх:



**Белыя**: b6, c5, c7, d6, h4, h6 (6). **Чорныя**: a3, a5, d8, f4, f8 (5). Выйгрыш.

А наступныя міні-праблемы разгледзьце па-за конкурсам. Іх рашэнні будуць улічвацца, калі ў конкурсных заданнях удзельнікі набяруць аднолькавую колькасць ачкоў:

1. **Белыя**: d2, e3, g3, g5, h2 (5). **Чорныя**: b4, e5, e7, f4, f8 (5). Нічыя: 1. gf6! e:g5 2. gh4 ba3 3. h:d4 ab2 4. e:g5 bc1 5. dc3 c:h6 6. hg3!! fe7. Працяг гульні застаецца за вамі.

2. **Белыя**: b4, e5, e7, g5, h6 (5). **Чорныя**: a3, b2, e3, f8, g7 (5). Перамога белых.

**СВОЙ КОНКУРС**

Майстар Пётр Шклудаў (Наваполацк) выправіў адзін свой стары эцюд і прапануе пашукаць у ім пераможны манеўр белых:



№ 15/12. **Белыя**: d2, дамкі e3, g1 (3). **Чорныя**: b6, c5, c7, d4, f6, g7 (6).

❍❍❍

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: *220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».*

**РАШЭННІ**

«Ігрок, рашальнік, прапагандыст»: № 2 (А. Пярхальскі — У. Бандарык). 1. hg7 2. cb4 3. ed2 4. h:f8=. Аўтарскі: **16/5** (Л. Вітошкін): 33, 24, 34, 4 (28-32) 36, 47х.

Дапытлівыя аналітыкі Аляксандр Белы (Наваполацк), Віталь Варушыла і Часлаў Якубоўскі (Мінск), Аляксандр Кіслы (Узда), Уладзімір Сапяжынскі (Рагачоў і інш. указалі ў двайной праблеме ў заметцы «Разнастайны спецыяліст» 1. cb8 2. bc7/gf4х, а таксама ў аўтарскім-16/3 заўважылі 1. 33/5/4/14/15х. Яны справіліся і з першым-другім заданнямі аўтарскага конкурсу-16.

## У НАСТУПНЫМ НУМАРЫ

**Мы жывём у век імклівага развіцця інфармацыйных тэхналогій. Настолькі імклівага, што адставанне ў гэтай сферы пагражае ўсім нам сур'ёзнымі эканамічнымі і іншымі стратамі ўжо ў недалёкай будучыні. Каб быць на ўзроўні, трэба ўжо сёння вучыць школьнікаў не толькі азам работы з камп'ютарам, але і авалоданню з яго дапамогай першаснымі навыкамі інфармацыйных тэхналогій, прывіваць ім густ да іх. А каму і дзе вучыць гэтаму?**

**Даты | Падзеі | Людзі**

**1945** год — у Патсдаме, каля Берліна, пачала работу Патсдамская канферэнцыя кіраўнікоў урадаў галоўных дзяржаў-пераможцаў у 2-й сусветнай вайне — СССР (І.В. Сталін), ЗША (Г. Трумэн) і Вялікабрытаніі (У.Чэрчыль, з 28 ліпеня К. Этлі). Гэта быў першы выхад у свет Сталіна ў званні генералісімуса, першы выхад на міжнародную арэну прэзідэнта ЗША Гары Трумэна і апошняя буйная падзея ў палітычным жыцці Уінстана Чэрчыля. Канферэнцыя прыняла рашэнне аб дэмілітарызацыі Германіі, знішчэнні германскіх манаполій, аб заходняй мяжы Польшчы; пацвердзіла перадачу СССР г. Кёнігсберга і прылеглага да яго раёна і іншае. У Патсдаме былі дасягнуты дамовы аб мірным пасляваенным упарадкаванні ў Еўропе.

**1846** год — нарадзіўся вядомы рускі падарожнік Мікалай Міклуха-Маклай. Большую частку свайго жыцця ён прысвяціў вывучэнню карэннага насельніцтва Аўстраліі, Акіяніі і Новай Гвінеі. Ён сабраў унікальныя звесткі для развіцця антрапалогіі і этнаграфіі. Нанёс на карту новы праліў і архіпелаг, адкрыў невядомыя віды раслін. Папуасы называлі яго «тамо-рус» — рускі чалавек. Маклай прыйшоў да іх без зброі, з жаданнем зразумець і дапамагчы. І ў знак захаплення і здзіўлення атрымаў новае імя: «караан-тамо» — чалавек з Месяца. Усе яго падарожжы называліся «Экспедыцыі за чалавекам». Ён даказваў, што чалавечая раса мае адзіны корань. Што размовы аб вышэйшых і ніжэйшых расах бессэнсоўныя. І што служыць навуцы — гэта даць людзям магчымасць даведацца адзін пра аднаго.



**1947** год — нарадзіўся (Шклоўскі раён) Валянцін Цярэнцьевіч Барухоў, беларускі вучоны, доктар фізіка-матэматычных навук (1997). Аўтар навуковых работ па дыферэнцыяльных ураўненнях і матэматычнай тэорыі кіравання. Распрацаваў новы падыход у даследаваннях структурных уласцівасцяў лінейных дынамічных сістэм кіравання.

**Уладзімір Караткевіч (1930—1984), паэт, празаік, драматург, публіцыст:**

**Было сказана**

*«Аптымізм беларускі ў тым, што калі мы, нягледзячы на ўвесь песімізм і безнадзейнасць мінулага, усё ж жывём, значыць, у нас ёсць падставы гаварыць аб лепшым будучым».*

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

**ЧАСТУЙЦЕСЯ!**

### Піражкі з хрусткага рассыпістага цеста



**Спатрэбіцца:** *мука пшанічная (для цеста) — 3 шкл., маргарын (для цеста) — 200 гр., яйкі (для цеста — 1, у начынку — 5) — 6 шт., цукар (для цеста) — 1 ст. л., соль (для цеста) — 0,5 ч. л., дрожджы сухія (для цеста) — 2 ч. л., капуста белакачанная (у начынку, сярэдні качан) — 1/2 шт., малако (у начынку) — 1/2 шкл., масла сметанковае (у начынку) — 2 ст. л., алей (у начынку) — 2 ст. л., соль, перац (у начынку на смак).*

Муку прасейце ў глыбокую міску, змяшайце з дрожджамі. Дадайце кавалачкамі маргарын пакаёвай тэмпературы і разатрыце рукамі ў аднастайныя крупкі. Яйка з цукрам узбіце ў шклянцы, дадайце соль і даліце вады даверху. Часткамі ўліце змесціва шклянкі ў мучную сумесь, змешваючы рукой, замясіце мяккае эластычнае цеста, загарніце яго ў плёнку і прыміце ў маразільнік на 30 хвілін.

Капусту нашаткуйце. У глыбокую патэльню наліце алей і дадайцеь сметанковае масла, разагрэйце патэльню, выкладзіце капусту і на моцным агні абсмажце яе хвілін 6-8, затым пасаліце, папярчыце, дадайце малако і патушыце капусту яшчэ хвілін 5-7. Астудзіце. Дадайце нарэзаныя кубікамі яйкі і перамяшайце.

Гатовае цеста разрэжце на доўгія жгуты і потым на кавалачкі велічынёй з яйка. Раскачайце ў кружкі, пакладзіце начынку, краі зашчыпайце «вяровачкай». Выкладзіце піражкі на бляху і пастаўце падыходзіць на 20-25 хвілін. Затым намажце піражкі ўзбітым яйкам і пячыце пры 200 °C на працягу прыкладна 20-25 хвілін, пакуль хораша не зарумяняцца. Выньце, выкладзіце на блюда і накрыйце сурвэткай на 10-15 хвілін.

### Тварожна-рысавая запяканка з агрэстам



***Спатрэбіцца:*** *агрэст (можна замяніць на вішню, чарэшню, парэчку) — 150-200 гр., малако — 0,5 л., у тры пальцы солі, цэдра лімона суцэльная — 0,5 шт., рыс круглы — 125 гр., сметанковае масла — 30 гр., яйкі — 4 шт., цукар — 50 гр., тварог — 130 гр., цукровая пудра.*

Агрэст вымыць, абсушыць і адрэзаць хвосцікі. У малако пакласці рыс, у тры пальцы солі, лімонную цэдру і давесці да кіпення. Паменшыць агонь і варыць 25 хвілін. Яечныя жаўткі ўзбіць з маслам і цукрам. Бялкі ўзбіць асобна да ўстойлівых пікаў. З гатовага рысу выдаліць цэдру і даць яму астыць. Затым рыс і тварог (працёрты) дадаць да жаўткоў і добра размяшаць. Асцярожна ўвесці ў масу бялкі. У змазаную алеем ці маслам форму выліць цеста.



Зверху выкласці ягады і паставіць у разагрэтую да 175 градусаў духоўку. Праз 40 хвілін выключаем, даём запяканцы трохі астыць. Можна пасыпаць цукровай пудрай!

-2862-

**ПАРАДЫ БЫВАЛЫХ**

### Котка ў доме без праблем

**Маментальнае пазбаўленне ад паху**

Каб асвяжыць каціны туалет, выдаліце з яго частку скарыстанага напаўняльніка, а пакінутую частку прысыпце содай. Каб асвяжыць падсцілку ці дыванок вашага гадаванца, таксама насыпце зверху соду, пачакайце 5 хвілін, а затым прапыласосьце падсцілку. Калі ваш гадаванец сапсаваў падлогу ці дыван у пакоі, ёсць некалькі спосабаў пазбавіцца ад паху. Растварыце 5-7 кропляў ёду ў літры вады і пратрыце падлогу ці цёмны дыван. Часам можна выкарыстоўваць воцат ці гаспадарчае мыла.

**Выдаленне плям**

Для імгненнага выдалення плям на плітцы вакол міскі жывёлы скарыстайцеся звычайным спіртам ці спіртавымі сурвэткамі. Спірт добра спраўляецца з тлустымі плямамі і імгненна высыхае, не пакідаючы разводаў. Таксама ён падыдзе для выдалення адбіткаў лапак і носа цікаўных гадаванцаў са шкла і люстэркаў.

**Кантэйнер для корму**

Каб сухі корм, які захоўваецца ў вялікіх пакетах, не адсырэў пасля таго, калі іх адкрыеце, і не рассыпаўся, перакладзіце яго ў пластыкавы кантэйнер з вечкам.

**Канапа**

Калі хатні ўлюбёнец любіць паляжаць на вашым ложку ці канапе, пакладзіце пад дэкаратыўныя падушкі невялікія канверцікі з абсарбентам. Гэта можа быць харчовая сода ці раздроблены актываваны вугаль. Абсарбент не дасць увабрацца паху ў абіўку канапы.

**Барацьба з поўсцю**

Каб увесь час не пыласосіць каціную поўсць з дываноў і мяккай мэблі, перыядычна праціраце ўпадабаныя месцы жывёлы, надзеўшы на руку гумовую пальчатку. Калі яе трохі намачыць вадой, поўсць імгненна прыліпне да пальчаткі. (Для шоўку трэба выкарыстоўваць сухія гумовыя пальчаткі.) Рэгулярна вычэсвайце поўсць адмысловай шчотачкай. Рабіць гэта трэба не радзей чым два-тры разы ў тыдзень, а ў перыяд лінькі — штодня.

**ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ**

### Старыя скрынкі з-пад абутку



Старыя абутковыя скрынкі можна выкарыстоўваць для захоўвання ніжняй бялізны.

Для зручнасці захоўвання ў вечках выражце ўзор. Не адкрываючы скрынкі, вы зможаце ўбачыць, што знаходзіцца ўсярэдзіне. Выразаць такі ўзор у вечку можна макетным нажом, перанёсшы малюнак па трафарэце на ўнутраны бок вечка. Затым пафарбаваць скрынку для захоўвання бялізны акрылавай фарбай.

-2863-

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.00 | 21.31 | 16.31 |
| Віцебск — | 4.42 | 21.27 | 16.45 |
| Магілёў — | 4.50 | 21.21 | 16.31 |
| Гомель — | 4.55 | 21.09 | 16.14 |
| Гродна — | 5.17 | 21.44 | 16.27 |
| Брэст — | 5.26 | 21.37 | 16.11 |

### Месяц

***Маладзік 19 ліпеня. Месяц у сузор'і Рака.***

### Імяніны

***Пр.*** *Аляксандры, Анастасіі, Вольгі, Марыі, Таццяны, Аляксея, Андрэя, Мікалая, Фёдара, Фядота, Яфіма.* ***К.*** *Ядвігі, Аляксея, Багдана, Марціна.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

Дыялогі ў сеціве.

«Дзяўчаты, хто збіраецца купляць машынку для стрыжкі мужоў, памятайце, што першага зараду батарэі хапае толькі на паўгалавы! :)»

**Сустракаюцца неяк вечарам удаў і трус. Трус, весела:**

**— Ты чуў пра новы закон — пасля шасці не есці?**

**Удаў, ляніва:**

**— Чуў, ты шосты.**

Кажуць, што руская жанчына каня на скаку спыніць, у ахопленую полымем хату ўвойдзе...

А ведаеце, чаму яна каня на скаку спыніць?

Гэта, каб прынц не праехаў міма!





ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by; e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 27.631. Індэкс 63850. Зак. № 3188.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 16 ліпеня 2012 года.